Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
11 САКАВІКА 2014 г. АЎТОРАК № 44 (27654) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


Консул Латвіі пра візы і добрасуседства
СТАР. 4


Шляхамі Тышкевіча па Віліі
СТАР. 6


Па-за кадрам тэлепраекта «У вас будзе дзіця»
СТАР. 8

# З ВЯСНОЙ НАВЫПЕРАДКІ


Нечакана сонечнае і цёплае надвор'е паклікала ў нядзелю шматлікіх жыхароў сталіцы на адпачынак у Лошыцкі парк.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «ДАЖЫНКІ» зменяць фармат

**Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі» зменіць фармат. Такое рашэнне прынята 10 сакавіка ў час даклада Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку па гэтым пытанні, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што «Дажынкі» з'яўляюцца карысным для краіны святам, паколькі за час іх правядзення былі прыведзены ў парадак як вялікія, так і невялікія гарады. «Там, дзе прайшлі кірмашы, пасля гэтага заставаўся добры след для народа. У гэтым каштоўнасць гэтага фестывалю. Але скажам шчыра, што ёсць і пэўныя недахопы ў гэтым працэсе ў той форме і ў тым выглядзе, у якім мы гэта праводзілі»,— лічыць Прэзідэнт.

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што фестываль задумваўся як падвядзенне вынікаў сельскагаспадарчага года, аднак у пачатку восені, калі праводзіцца свята, яшчэ рана гаварыць пра вынікі, паколькі нямала сельгаскультур яшчэ застаецца не ўбрана, напрыклад цукровыя буракі, кукуруза. «Інакш кажучы, мы падводзім вынікі фактычна толькі па збожжавых культурах. Вось у гэтым пэўны недахоп»,— заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што за аснову трэба браць перш за ўсё не валавыя аб'ёмы, ураджайнасць, аб'ёмы выраблenага, а эфектыўнасць продажаў, атрыманы прыбытак, грошы на рахунках. «А такую інфармацыю мы можам мець толькі па выніках года»,— дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У той жа час Прэзідэнт лічыць, што з боку губернатараў намецілася нейкая ўтрыманская пазіцыя ў тым плане, што на месцах за правядзенне «Дажынак» змагаюцца толькі таму, што з рэспубліканскага бюджэту выдзяляюцца сродкі, за якія на іх тэрыторыі прыводзіцца ў парадак пэўны населены пункт. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, добраўпарадкаванне гарадоў — гэта добра, гэта трэба рабіць і захаваць і ў будучыні.

Аднак, як лічыць Аляксандр Лукашэнка, на ўзроўні Прэзідэнта вынікі сельскагаспадарчага года трэба падводзіць больш «дакладна і маштабна». У прыватнасці, ён прапанаваў ушаноўваць аграрыяў у Палацы Незалежнасці ў пачатку каляндарнага года, дзе будуць уручацца ў тым ліку і дзяржаўныя ўзнагароды.

Што датычыцца фармату «Дажынак», то прынята рашэнне праводзіць іх у раёнах на базе аднаго з аграгарадкоў. На думку Прэзідэнта, такім чынам за 10–12 гадоў яны будуць прыведзены ў поўны парадак. «Гэта значыць, мы дадзім новае дыханне аграгарадкам. І зможам завяршыць тую праграму, якую мы перад сабой паставілі»,— сказаў кіраўнік дзяржавы.

На абласным узроўні «Дажынкі» будуць праводзіцца ў раённых цэнтрах, за выключэннем гарадоў абласнога падпарадкавання і тых, дзе праходзіў ужо фестываль-кірмаш, што таксама дасць магчымасць належным чынам іх добраўпарадкаваць.

Прынята рашэнне змяніць намінацыі, па якіх праводзіцца рэспубліканскае спаборніцтва. У прыватнасці, не будуць падводзіцца вынікі сярод сельскагаспадарчых арганізацый (іх філіялаў), раёнаў і абласцей за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур. У той жа час уводзіцца намінацыя па ўзнагароджанні старшых камбайнераў і камбайнераў, прыцягнутых у сельгасарганізацыі на ўборку збожжавых і зернебабовых культур. Таксама прапануецца ўшаноўваць і пераможцаў рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар вёскі».

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:**

***«Агітацыйная кампанія па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў у Мінску праходзіць актыўна. У ёй удзельнічаюць ініцыятыўныя групы ўсіх зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты. На маю думку, агітацыйную работу ў гэтыя дні неабходна весці пастаянна, ніякіх перашкод быць не павінна. Хацеў бы звярнуць увагу на тое, што да жыхароў сталіцы трэба данесці інфармацыю пра ўсіх кандыдатаў у дэпутаты, якія прынялі рашэнне балатавацца ў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў. Неабходна дастойнае і дастатковае волевыяўленне жыхароў Мінска на маючых адбыцца выбарах».***

## ЦЭНЫ ВЫРАСЛІ НА 2%

**У Беларусі інфляцыя за люты ў параўнанні са студзенем склала 2%, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.**

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лютым склаў 102%, у адносінах да снежня 2013-га — 103,6%. Цэны на харчовыя тавары ў лютым у параўнанні са студзенем выраслі на 1,8%, у параўнанні са снежнем мінулага года — на 4,2%. Цэны на нехарчовыя тавары ў лютым у параўнанні са студзенем сталі вышэй на 0,3%, са снежнем 2013 года — на 0,9%.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ На слыху

## АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ САЛДАТЫ

### ЗАМЕСТ ВАЕННАЙ ФОРМЫ — СПЕЦВОПРАТКА, ЗАМЕСТ АЎТАМАТА — ВЕНІК І РЫДЛЁЎКА

**Такая альтэрнатыва неўзабаве будзе прапанавана юнакам прызыўнога ўзросту, якія адмаўляюцца служыць у арміі. Вядома, аднаго нежадання тут недастаткова. У першую чаргу, законапраект «Аб альтэрнатыўнай службе», які паступіў на разгляд у Палату прадстаўнікоў, будзе тычыцца тых хлопцаў, для каго нашэнне і прымяненне зброі супярэчыць іх рэлігійным перакананням.**

Воінскі абавязак у такім выпадку будзе заменены працоўным. Праўда, замест звычайных 1,5 года альтэрнатыўшчыкаў чакаюць 2,5 года. Але на грамадзянцы.

— Альтэрнатыўную службу юнакі будуць праходзіць у арганізацыях аховы здароўя, сацыяльнай сферы, жыллёва-камунальнай, сельскай і лясной гаспадаркі,— зазначыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ.**— Таксама хлопцы будуць задзейнічаны ў арганізацыях, якія займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторый, будаўніцтвам і рамонтам дарог, у падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У якіх канкрэтна ўстановах будуць праходзіць працоўную службу юнакі, вызначыць Міністэрства працы і сацабароны. Дапамогуць у гэтым і аблвыканкамы. Толькі гэта не значыць, што працаваць юнакі будуць па месцы жыхарства. Магчыма, камусьці пашчасціць. Толькі ўсё роўна пражываць яны будуць не дома, а ў добраўпарадкаваных грамадзянскіх інтэрнатах.

За 2,5 года службы прадугледжаны адпачынак — 30 дзён. У арміі, дарэчы, не намнога менш. Як і ў войску, для маладых людзей з вышэйшай адукацыяй існуе бонус: для іх служба будзе цягнуцца крыху больш за 1,5 года. У арміі, у сваю чаргу, юнакоў з дыпломам аб заканчэнні ВНУ больш чым год не трымаюць.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## НА ВЫХАДНЫЯ ПАХАЛАДАЕ

### У нядзелю прагназуецца нават мокры снег

**На працягу гэтага тыдня тэрыторыя нашай краіны яшчэ застанецца пад уплывам зоны павышанага ціску, таму і ў аўторак будзе пераважна без ападкаў, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Між іншым, ужо сёння да нас завітае ўмераны паўночны вецер, па паўночным усходзе — парывамі да 14 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень 7–12 цяпла. Не будзе ападкаў і ў сераду, аднак раніцай па паўднёвым захадзе слабы туман. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — 5–11 цяпла. Даволі камфортна і без ападкаў чакаецца ў чацвер і пятніцу, калі слабы туман магчымы толькі ў паўднёвых раёнах Беларусі. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — 7–12 цяпла, а па паўднёвым захадзе прыгрэе нават да плюс 15 градусаў. Цудоўнае веснавое надвор'е, але…

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на выхадныя характар надвор'я істотна зменіцца. У гэтыя два дні чакаюцца сур'ёзныя ападкі, галоўным чынам дождж, а ў нядзелю часам будзе ісці і мокры снег. Стане сапраўды ветрана, што яшчэ пагоршыць надвор'е. Тэмпература паветра ўначы прагназуецца ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень у суботу яшчэ ад плюс 5 па паўночным захадзе, да 15 цяпла па паўднёвым усходзе. Істотна пахаладае менавіта ў нядзелю, калі ўдзень будзе толькі 2–8 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Клопат

## ВЕТЭРАНАМ — ЛЕПШЫЯ САНАТОРЫІ КРАІНЫ

**Усе ўдзельнікі і інваліды Вялікай Айчыннай вайны ў гэтым годзе будуць забяспечаны пуцёўкамі ў здраўніцы.**

Па словах дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў Генадзя Балбатоўскага, сёлета, калі мы святкуем 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, асаблівая ўвага будзе нададзена гэтай катэгорыі грамадзян.

Пры гэтым ён паабяцаў, што пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны будуць закуплены ў лепшыя санаторыі рэспублікі: санаторый «Прыазёрны» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, санаторыі «Парэчча», «Радон», санаторыі «Прыдняпроўскі», «Лётцы», санаторый КУП «Брэстаграздраўніца», Лепельскі ваенны санаторый і іншыя.

**Дарэчы**

*У 2013 годзе 1109 ветэранаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны былі накіраваны на санаторна-курортнае лячэнне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і сродкаў Саюзнай дзяржавы.*

**Святлана БУСЬКО**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПЕКІН ЗАКЛІКАЎ ЗША БЫЦЬ БОЛЬШ СТРЫМАНЫМІ ВА ЎКРАІНСКІМ ПЫТАННІ



На фоне заяў ЗША аб гатоўнасці аказаць украінскаму народу «сур'ёзную падтрымку» ў вяртанні кантролю над Крымам, новыя ўлады якога рыхтуюць паўвостраў да рэферэндуму аб уваходжанні ў склад РФ, адбылася тэлефонная размова кіраўніка Белага дома — Барака Абамы — з кітайскім лідарам Сі Цзіньпінам. Раней, калі Вашынгтон і ЕС яшчэ толькі абмяркоўвалі ўвядзенне санкцый супраць Расіі, Пекін выступіў з заявай супраць практыкі пагрозы санкцыямі ў міжнароднай палітыцы. І цяпер старшыня КНР заклікаў Абаму да стрыманасці ва ўкраінскім пытанні. Пекін настойвае на тым, каб крызіс быў вырашаны пры дапамозе дыпламатычных і палітычных сродкаў, шляхам перамоў і кансультацый. «Сітуацыя ва Украіне надзвычай складаная. У гэтых умовах усе бакі павінны праяўляць стрыманасць, каб не дапусціць выхаду напружанасці на новы віток»,— заявіў Сі Цзіньпін.

### НЕДАХОП СНУ ПАРАЎНАЛЬНЫ З АЛКАГОЛЬНЫМ АП'ЯНЕННЕМ

З-за недахопу сну ў арганізме павышаецца канцэнтрацыя стрэсавага гармону картызолу. Трохі падае тэмпература цела, і імунітэт перастае працаваць у поўную сілу. А вось мозг у такой сітуацыі дзейнічае гэтак жа, як і пры алкагольным ап'яненні. З пункту гледжання выканання задання на зрокава-маторную каардынацыю, кожная гадзіна няспання адпавядае дадатковай канцэнтрацыі спіртнога ў крыві, роўнай 0,004%. Атрымліваецца, што чалавек, які спаў менш за пяць гадзін, мае парушаную каардынацыю. Часцей за ўсё з гэтай праблемай сутыкаюцца маладыя людзі, бо яны дрэнна перажываюць недахоп сну.

ISSN 1990 - 763X
14044
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗНІКЛЫ «БОІНГ» СПАРАДЗІЎ ВЕРСІЮ ПРА «МІСТЫЧНУЮ ЗАГАДКУ»

Выратавальнікам, якія шукалі зніклы ў Паўднёва-Кітайскім моры Boeing –777–200 рэйса MH370, зноў не ўдалося знайсці абломкі лайнера з 227 пасажырамі і 12 членамі экіпажа на борце. У другой палове панядзелка ўсе надзеі пошукавікаў былі звязаны з «жоўтым прадметам» у раёне знікнення лайнера. Меркавалася, што гэта мог быць выратавальны плыт. Аднак накіраваны на праверку в'етнамскі верталёт развеяў надзеі. Гэта ўжо трэцяя знаходка з пачатку пошукаў. Выяўленыя раней дзве вялікія алейныя плямы на паверхні (а ў іншым месцы — магчымы абломак паветранага судна) не мелі дачынення да зніклага «Боінга». Лайнер, які выконваў рэйс з Куала-Лумпура ў Пекін, пошукавікі ўжо назвалі «небывалай загадкай у гісторыі авіяцыі».




Маштабы пошукавай аперацыі і поўная адсутнасць знаходак прымушаюць экспертаў меркаваць угон ці нават выбух бомбы на борце. Пра гэта можа сведчыць і той факт, што самалёт да моманту знікнення не перадаваў дыспетчарам паведамленняў пра трывогу ці тэхнічныя непаладкі. Але расшыфроўка даных з амерыканскага спадарожніка сачэння паказала, што той не фіксаваў выбухаў над акваторыяй раёна знікнення. А радары паспелі зафіксаваць разварот лайнера. Як мяркуюць авіяцыйныя ўлады Малайзіі, пілоты маглі зрабіць гэта з намерам вярнуцца назад у Куала-Лумпур.

КОРАТКА

Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі за студзень 2014 года склалася дадатнае ў памеры $259,2 млн.

За люты беларусы прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на $736,6 млн у эквіваленце, купілі — $756,1 млн.

Білет на матч ЧС па хакеі ў Мінску дае права толькі аднаразовага ўезду ў Беларусь на бязвізавай аснове ў перыяд правядзення чэмпіянату.

У Беларусі павышаны мінімальныя адпускныя цэны на алкагольныя напіткі мацункам большым за 28% і на спірт этылавы з харчовай сыравіны.

Паводле праекта пагаднення аб перамяшчэнні службовай і грамадзянскай зброі паміж дзяржавамі — членамі Мытнага саюза, краіны МС увядуць адзіны дакумент на перамяшчэнне зброі, адзіны еўразійскі паляўнічы білет, з якім грамадзяне змогуць ездзіць на паляванне па тэрыторыі саюза на адзіных падставах без дадатковых дазволаў.

Кампанія CSM Bessac (Францыя) пастаўіць інавацыйнае абсталяванне для будаўніцтва трэцяй лініі мінскага метро коштам амаль 11,5 млн еўра.

■ 15 сакавіка — Дзень Канстытуцыі

## ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА

**Кожная дзяржава мае свае найважнейшыя этапы развіцця, падзеі, якія аказваюць у далейшым лёсавызначальны ўплыў на сацыяльныя і культурныя працэсы.**
**15 сакавіка 1994 года — гістарычная падзея, якая стала сімвалам якаснага змянення беларускай дзяржаўнасці. У гэты дзень была прынята новая Канстытуцыя — Асноўны Закон нашай дзяржавы. Як вядома, значэнне Канстытуцыі ў любой дзяржаве такое вялікае, што сам факт яе прыняцця ацэньваецца як крок да дэмакратыі, да палітычнай, сацыяльнай стабільнасці.**

Два дзесяцігоддзі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — тэрмін для гісторыі параўнальна невялікі. Канстытуцыя, якая ўпершыню ў нашай гісторыі была прынята шляхам свабоднага дэмакратычнага волевыяўлення, адлюстравала маральны, палітычны ўзровень грамадства, яго асноўныя ідэі канца XX стагоддзя, увасобіла ў сабе сацыяльныя ідэалы беларускага народа, якія найбольш ярка выражаны ў вершы Я. Купалы «А хто там ідзе?»

*А хто там ідзе, а хто там ідзе*
*У агромністай*
*такой грамадзе?*
*— Беларусы…*
*А чаго ж, чаго захацелася ім,*
*Пагарджаным век,*
*ім, сляпым, глухім?*
*— Людзьмі звацца.*

Канстытуцыя як прадукт пэўнай ступені развіцця грамадства з'явілася найвышэйшым дасягненнем палітычнай і прававой культуры народа. Разам з тым, яна ўзнікла не на пустым месцы. Канстытуцыя ўвабрала ў сябе папярэднюю традыцыю беларускага канстытуцыяналізму, вопыт канстытуцыйнага будаўніцтва ў СССР, краінах Заходняй Еўропы, высновы навукі канстытуцыйнага права.

Прыняццю Канстытуцыі папярэднічаў пачатак канстытуцыйнай рэформы, якая праходзіла паралельна са станаўленнем новай беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах вострай палітычнай барацьбы. Дастаткова ўспомніць Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце (27 ліпеня 1990 г.), важныя палажэнні якой прадвызначылі змест новай Канстытуцыі. Ва ўмовах палярызацыі грамадскай свядомасці, нарастальнага чакання людзей аб прызнанні палітычнага і эканамічнага плюралізму Канстытуцыя 1978 года імкліва ператваралася ў архаічны дакумент, што патрабавала яе бесперапыннага абнаўлення. Шматлікія законы аб змяненнях і дапаўненнях беларускай Канстытуцыі 1978 года (толькі з ліпеня 1990 г. па люты 1994 г. такія законы прымаліся 16 разоў) датычыліся асноў грамадскага ладу, статусу палітычных партый, арганізацыі і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады. Імклівае развіццё канстытуцыйнага працэсу завяршылася дасягненнем палітычнага кампрамісу, выпрацоўкай і заключэннем грамадскага пагаднення, юрыдычным афармленнем якога стала Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыя як найважнейшы палітыка-прававы дакумент, вышэйшы акт народаўладдзя юрыдычна афарміла якасна новую сістэму дзяржаўнасці, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены, якія адбыліся ў дзяржаве і грамадстве.

СТАР. 2

# АБ'ЕКТАМ БЕЛАЭС ПРЫСВОЕНЫ СТАТУС УСЕБЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗЕВАЙ БУДОЎЛІ

**Улічваючы асаблівую стратэгічную значнасць Беларускай атамнай электрастанцыі, яе аб'ектам, якія будуюцца, прысвоены статус Усебеларускай моладзевай будоўлі. Як паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе кіраўніка дзяржавы, адпаведны ўказ № 118 «Аб моладзевых будоўлях» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 10 сакавіка.**

Дакумент прыняты ў мэтах далейшай папулярызацыі і развіцця студатрадаўскага руху, аб'яднання маладых людзей значнай грамадзянска-патрыятычнай ідэяй, прыцягнення моладзі на вядучыя будаўнічыя аб'екты краіны.

Указам устаноўлены парадак прысваення статусу Усебеларускай моладзевай будоўлі і статусу абласной (Мінскай гарадской) моладзевай будоўлі аб'ектаў, якія будуюцца. Фарміраванне студэнцкіх атрадаў для работ на моладзевых будоўлях ускладаецца на ГА «БРСМ».

# ПАСЛЯ ЧАВЕСА

**На форуме «Чавес — сімвал рэвалюцыі ў Лацінскай Амерыцы і за яе межамі», які прайшоў у Мінску ў гадавіну смерці былога венесуэльскага прэзідэнта, гутарка ішла пра дасягненні баліварыянскай рэвалюцыі і пра асобу Уга Чавеса — аднаго з самых цікавых палітыкаў XXI стагоддзя.**

Сёння Венесуэла — значны ігрок на міжнароднай арэне. Аднак яшчэ два дзесяцігоддзі таму гэта краіна, можна сказаць, не мела голасу: большая частка яе нафтавых актываў (а на апошніх амаль цалкам пабудавана эканоміка краіны) належала Злучаным Штатам Амерыкі. Тым не менш, дзякуючы палітыцы Чавеса — самага важкага палітыка ў рэгіёне з часоў Сімона Балівара — Венесуэла цалкам распараджаецца сваімі карыснымі выкапнямі.

Па словах **Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Амерыка Дыяса НУНЬЕСА,** яго краіна не мае непад'ёмнага знешняга доўгу. А дзякуючы арыентаванай на дабрабыт народа палітыцы Уга Чавеса сённяшняя Венесуэла дасягнула максімальнага за ўсю сваю гісторыю індэкса чалавечага развіцця.

**Віктар ШЭЙМАН, упраўляючы справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,** у сваім выступленні падкрэсліў, што нацэленасць на стратэгічнае партнёрства з Венесуэлай застаецца прыярытэтным кірункам у знешняй палітыцы нашай краіны. Ён нагадаў, што ў Маракаі, сталіцы штата Арагуа, адным з буйнейшых гарадоў Венесуэлы, беларусы пабудавалі 4000 кватэр, а ў штаце Міранда хутка здадуць яшчэ 10000. За 6 гадоў сумеснае прадпрыемства па здабычы нафты і газу «Петралера Бела-Венесалана» атрымала больш за 5 з паловай мільёнаў тон нафты і больш за 750 мільёнаў кубічных метраў газу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ САЛДАТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі для альтэрнатыўшчыкаў і гэта не аргумент, то ўсё роўна «халявы» чакаць не прыйдзецца. Працаваць юнакі будуць па 48 гадзін у тыдзень. Аб вялікіх заробках марыць не трэба. Штомесяц хлопцы будуць атрымліваць грашовае забеспячэнне ў памеры 150% найбольшай велічыні пражытачнага мінімуму. А гэта каля двух мільёнаў. Праз год альтэрнатыўнай службы грашовае забеспячэнне павялічыцца на 20%, праз два гады — на 40%.

Згодна з праектам закона, юнакі, якія будуць праходзіць альтэрнатыўную службу, вызваляюцца ад аплаты за карыстанне прадастаўленым ім памяшканнем для пражывання і за жыллёва-камунальныя паслугі. Акрамя таго, альтэрнатыўшчыкі змогуць разлічваць і на бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі ў выпадку хваробы.

«Законапраектам прадугледжаны дадатковы водпуск па хваробе, а таксама ў сувязі з паступленнем ва ўстановы адукацыі і атрыманнем адукацыі, з уважлівых прычын асабістага і сямейнага характару», — паведамілі ў міністэрстве.

Законапраект яшчэ не прыняты. Магчыма, некаторыя палажэнні будуць заменены, удакладнены ці ўвогуле скасаваны. Аднак калі ўсё ж такі вышэйзгаданы варыянт закона задаволіць дэпутатаў, то мінімум за 10 дзён да заканчэння прызыўной кампаніі юнак павінен напісаць заяву аб замене вайсковай службы на альтэрнатыўную і падаць яе ў ваенкамат па месцы жыхарства. На пасяджэнні камісіі ў прысутнасці прызыўніка, які па стане здароўя прыдатны для праходжання службы ў арміі, заяву разгледзяць. Калі яна будзе задаволена, малады чалавек павінен будзе звярнуцца ў орган па працы, занятасці і сацабароне. Там і вызначаць, дзе ён пройдзе альтэрнатыўную службу.

Дарэчы, у Расіі падобны закон аб альтэрнатыўнай службе ўжо функцыянуе на працягу амаль дзесяцігоддзя. І трэба сказаць, такая альтэрнатыва асаблівай папулярнасцю не карыстаецца. Хутчэй за ўсё, расіян палохае тэрмін, які амаль удвая большы за службу ў арміі. А магчыма, вялікую ролю адыгрывае і пачуццё патрыятызму.

Нягледзячы на тое, што юнак, які зробіць свой выбар на карысць альтэрнатыўнай службы, па сваім прававым статусе будзе набліжаны да салдата тэрміновай службы, у вачах людзей, хутчэй за ўсё, ён назаўсёды застанецца «ўхілістам». Таму, верагодна, што з прыняццем закона чакаць вялікага напльіву альтэрнатыўшчыкаў не варта.

**Вераніка КАНЮТА.**

■ Мы — грамадзяне Беларусі

# Першы крок у дарослае жыццё

**Надзвычай цёплым і сонечным сакавіцкім днём у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу адбылася ўрачыстасць. Дваццаць 14-гадовых мінчан — лепшых прадстаўнікоў адоранай моладзі, выдатнікаў вучобы, удзельнікаў навукова-практычных канферэнцый, прызёраў і пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд, фестываляў, конкурсаў, спаборніцтваў — атрымалі пашпарты грамадзян Рэспублікі Беларусь.**

Гэтай падзеяй распачалася патрыятычная акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечаная Дню Канстытуцыі. Сёлета 15 сакавіка адзначаецца дваццаціґоддзе прыняцця Асноўнага Закона краіны.

Галоўны дакумент юнакам і дзяўчатам уручыў **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль РУБІНАЎ.**

«Для маладых людзей гэта важная падзея. Бо атрыманне пашпарта — першая прыступка ў дарослае жыццё. Цяпер яны не проста дзеці сваіх бацькоў, а грамадзяне, якія могуць у большай ступені, чым раней, прымаць рашэнні і несці адказнасць за іх», — сказаў кіраўнік верхняй палаты парламента.

Анатоль Рубінаў назваў падзею значнай не толькі для школьнікаў, але і для ўсёй краіны. Маладыя людзі нарадзіліся ў незалежнай Беларусі і з самага пачатку ўвабралі ў сябе гэта як данасць. Гэтаму пакаленню належыць будучыня, і старшыня Савета Рэспублікі выразіў спадзяванне, што юныя грамадзяне звяжуць свой лёс менавіта з Радзімай.

Уручаючы дакументы, Анатоль Рубінаў цікавіўся ў школьнікаў сферай іх захапленняў, кожнаму казаў цёплыя віншавальныя словы. Старшыня Савета Рэспублікі пажадаў хлопцам і дзяўчатам паспяхова скончыць школу, вызначыцца з будучай прафесіяй і сустрэць светлае каханне ў жыцці. А яшчэ — быць шчаслівымі і любіць сваю краіну.

**Першы сакратар ЦК БРСМ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар БУЗОЎСКІ** нагадаў, што разам з пашпартамі маладыя грамадзяне атрымалі не толькі правы, але і абавязкі, а таксама адзначыў, што моладдзю Беларусі варта ганарыцца.

«Вельмі прыемна, што я маю гонар быць запрошанай на ўрачыстае ўручэнне пашпартоў. Для мяне гэтая падзея абсалютна новая, і я вельмі рада, што ў нашай краіне звяртаюць увагу не толькі на дарослых, але і на дзяцей», — падзялілася ўражаннямі са «Звяздой» вучаніца класа прававога кірунку сталічнай СШ № 68 Карына Машчанок. Дзяўчына, між іншым, з'яўляецца ўладальніцай дыпломаў 2 і 3 ступені раённых алімпіяд па рускай і беларускай мовах.

Патрыятычная акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!» праходзіць па ўсёй краіне па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі з 2004 года. Штогод з 10 да 15 сакавіка прадстаўнікі заканадаўчай і выканаўчай улады, вядомыя людзі, ветэраны вайны і працы ва ўрачыстых абставінах уручаюць юнакам і дзяўчатам пашпарты грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі, Канстытуцыя «служыць надзейным арыенцірам дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на стварэнне эфектыўнай эканомікі, забеспячэнне сацыяльнай абароны і дабрабыту насельніцтва, беражлівае стаўленне да традыцый і каштоўнасцяў беларускага народа».

Канстытуцыя Беларусі замацавала рэальную ўладу народа, пра якую стагоддзямі марылі вядомыя беларускія асветнікі і паэты. Згодна з артыкулам 3 Канстытуцыі, адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ. Ён ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы.

У прыватнасці, у верасні 2012 года беларускі народ выказаў сваё прамое волевыяўленне на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якія праведзены ў адпаведнасці з нормамі і прынцыпамі Канстытуцыі і заснаваным на іх выбарчым заканадаўствам, што забяспечыла свабодны і дэмакратычны характар выбараў, стала чарговым сведчаннем праяўлення канстытуцыйнай дэмакратыі ў нашай краіне. 23 сакавіка 2014 года грамадзянам Беларусі трэба будзе выбраць сваіх прадстаўнікоў у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

На чацвёртым Усебеларускім народным сходзе, які ўяўляе сабой канстытуцыйную форму непасрэднага ўдзелу грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы, былі ўхвалены асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады.

Канстытуцыя — аснова палітычнага адзінства беларускага народа, грамадзянскай супольнасці і суверэннай дзяржаўнасці.

Беларуская Канстытуцыя інтэгруе ў сабе вышэйшыя прававыя і сацыяльныя каштоўнасці, гарантуе кожнаму грамадзяніну свабоды і правы, неабходныя для стваральнай працы, годнага жыцця і гарманічнага ўсебаковага развіцця асобы. Яна ўпершыню замацавала натуральныя (неадчужальныя) правы чалавека, паставіла яго ў роўныя ўмовы з дзяржавай, устанавіла іх узаемныя абавязкі і адказнасць. Правы і свабоды чалавека і гарантыі іх рэалізацыі — найважнейшая каштоўнасць. Ім прысвечана палова артыкулаў Канстытуцыі. Яны размешчаны ў ёй на першым месцы.

Артыкул 1 Канстытуцыі змяшчае мадэль развіцця Рэспублікі Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Максімальнае прыбліжэнне да гэтай мадэлі, да «дасканалага» грамадства магчыма толькі праз захаванне ўсімі Канстытуцыі, праз фарміраванне адпаведнай яе сутнасці правапрымяняльнай практыкі, праз захаванне правоў і свабод грамадзян і ўсвядомленае выкананне апошнімі сваіх абавязкаў. У гэтай справе вельмі важнае значэнне мае роля канстытуцыйнага кантролю, што ажыццяўляецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь, які такім чынам спрыяе фарміраванню дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы і ў першую чаргу абароне правоў, свабод і законных інтарэсаў чалавека і грамадзяніна. Канстытуцыйны Суд у адным са штогадовых пасланняў аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь адзначыў, што дэмакратыя і вяршэнства права — дзве ўзаемаабумоўленыя і ўзаемазвязаныя канстытуцыйныя каштоўнасці. З дэмакратыяй, заснаванай на Канстытуцыі, звязана рэалізацыя такіх канстытуцыйных каштоўнасцяў, як законнасць, роўнасць, справядлівасць, правы і свабоды чалавека.

Як вядома, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд нараўне з іншымі надзелены паўнамоцтвам ажыццяўляць абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і ўхваленых Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, да падпісання іх Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пры ацэнцы канстытуцыйнасці нормаў законаў у парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйны Суд зыходзіць з прынцыпаў і нормаў Канстытуцыі, выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу нормаў, што правяраюцца, а таксама з улікам агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, што знаходзіць выражэнне ў яго прававых пазіцыях.

За 2008—2013 гады ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйным Судом ажыццёўлена праверка канстытуцыйнасці 669 законаў, у тым ліку пяці кодэксаў.

Канстытуцыйным Судом за перыяд сваёй дзейнасці прынята звыш 1000 рашэнняў і ўнесена ў дзяржаўныя нарматворчыя органы каля 200 прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства.

Наша Канстытуцыя мае велізарны патэнцыял для фарміравання сапраўды народнай суверэннай дэмакратычнай прававой дзяржавы з канстытуцыйнай эканомікай для развіцця чалавека і ўсіх сфер жыццядзейнасці.

**Анатоль ЦІКАВЕНКА,**
**суддзя**
**Канстытуцыйнага Суда**
**Рэспублікі Беларусь.**

■ Спорт-тайм

# ЁСЦЬ ПЕРШЫЯ МЕДАЛІ НА ПАРАЛІМПІЯДЗЕ!

**Чарговая ўзнагарода Домрачавай, паражэнні футбольнай зборнай і фіяска Вікторыі Азаранкі. «Звязда» традыцыйна падводзіць вынікі галоўных спартыўных падзей краіны за мінулы тыдзень.**



Фота БЕЛТА.

**1. А пачнем з даволі прыемных падзей. Беларус Васіль Шапцябой (на фота) заваяваў бронзавы медаль на Паралімпійскіх гульнях у біятлоннай гонцы (7,5 км) сярод слабавідушчых.** Наш суайчыннік зрабіў два промахі на двух рубяжах і саступіў чэмпіёну Віталю Лук'яненку, украінскаму спартсмену, 47,8 секунды. Яшчэ адна «бронза» на рахунку Ядзвігі Скарабагатай, якая заняла трэцяе месца ў лыжнай гонцы на 15 кіламетраў сярод спартсменаў з парушэннем зроку.

**2. На пасляалімпійскім этапе Кубка свету па біятлоне, які адбыўся ў славенскай Паклюцы, беларусы заваявалі дзве ўзнагароды.** Надзея Скардзіна, бронзавы прызёр Алімпіяды ў Сочы, заняла трэці радок у спрынце, а Дар'я Домрачава стала лепшай у мас-старце. Наступны этап адбудзецца ў фінскім мястэчку Конціялахці і пачнецца 13 сакавіка. Пакуль у жаночым агульным заліку лідзіруе Кайса Мякарайнэн, на другім радку — Тура Бергер, на трэцім — наша Дар'я Домрачава.

**3. Зборная Беларусі па футболе правяла першы сёлетні матч.** Падапечныя Георгія Кандрацьева ў Сафіі сустрэліся з камандай Балгарыі. Вынік таварыскай сустрэчы 2:1 на карысць гаспадароў. Галявым ударам у складзе беларусаў вызначыўся паўабаронца БАТЭ Сяргей Крывец. «Гульня ў маёй каманды не атрымалася, — прызнаўся пасля таварыскай сустрэчы Георгій Кандрацьеў. — Гэта быў горшы матч, які правяла зборная пад маім кіраўніцтвам. Чамусьці мы былі не падрыхтаваны да яго. Магчыма, справа ў нагрузках у клубах, бо першынство ў нас яшчэ не распачалося». Дарэчы, сезон стартуе ўжо хутка — 15 сакавіка. Пад дахам сталічнага манежа адбудзецца паядынак за Суперкубак краіны паміж БАТЭ і «Мінскам». Пачатак сустрэчы — у 16:00.

**4. Андрэй Краўчанка заваяваў сярэбраны медаль у шматбор'і на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы ў памяшканнях, які прайшоў у польскім Сопаце.** Першы радок заняў амерыканец Эштан Ітан, трэці — бельгіец Томас ван дэр Платсэн.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ У тэму

# «НАШУ РАДАСЦЬ ЧУЛІ НА ПЕРШЫМ ПАВЕРСЕ»

**Бронзавы медаль стаў сапраўдным падарункам да 8 Сакавіка для жонкі і дачкі магілёўскага біятланіста Васіля Шапцябоя.**

— Як мы хваляваліся, цяжка перадаць словамі, — падзялілася жонка спартсмена Юлія, якая назірала за спаборніцтвамі дома каля тэлевізара разам з дачкой Алісай. — Мы жывём на 9 паверсе, але, калі стала вядома, што Васіль узяў «бронзу», нашы шчаслівыя крыкі былі чутны, напэўна, на 1-м паверсе. Праз нейкі час мы звязаліся з ім па скайпе і ён нам прадэманстраваў гэтую шчаслівую ўзнагароду. Васіль абяцаў зрабіць нам царскі падарунак і стрымаў абяцанне.

Наступныя гонкі біятланістаў на 12,5 кіламетра адбудуцца 11 сакавіка, і Юлія мае намер нават адпрасіцца з работы, каб сваімі вачыма назіраць за спаборніцтвамі і ў думках дапамагаць мужу.

Як адзначылі ва ўпраўленні спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама, на Васіля Шапцябоя ўскладаліся вялікія надзеі і ён іх апраўдаў. Дарэчы, на папярэдніх X зімовых Паралімпійскіх гульнях у Ванкуверы ён стаў двухразовым бронзавым прызёрам. Можна лічыць, што цяперашняя «бронза» спартсмена — таксама заслуга і яго лідара на мінулай Паралімпіядзе, а сёння трэнера Мікалая Шаблоўскага.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# «СНЕЖНЫ СНАЙПЕР» — НЕ ПРОМАХ

**Мінск у сёмы раз прыняў фінал рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.**

Самыя масавыя дзіцячыя спаборніцтвы краіны па біятлоне, лыжных гонках і пнеўматычнай стральбе — трапная характарыстыка першынства, якое штогод кліча на старты тысячы беларускіх дзяўчат і хлопцаў. Гэтым разам у сталіцы сабралася 200 школьнікаў з усёй краіны! Па традыцыі, юныя спартсмены ў першы дзень выяўлялі наймацнейшага ў стральбе, а назаўтра — у лыжных забегах.

— Адна з нашых задач — заахвоціць як мага больш дзяцей, якія б здолелі займацца лыжным спортам, стральбой, а ў будучыні, магчыма, і біятлонам, — кажа **Аляксандр КУЛЕШ, галоўны спецыяліст сектара інфармацыі і грамадскіх сувязяў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.** — Штогод у нашых спаборніцтвах удзельнічаюць каля 200 тысяч дзяцей. Распачынаюцца гэтыя спаборніцтвы яшчэ на ўзроўні звычайных школ, а завяршаюцца буйным рэспубліканскім стартам у Мінску. Таксама хочацца, каб дзеці з пэўнымі талентамі пасля здолелі перайсці ў спартыўныя школы і здолелі займацца любімым спортам на прафесійнай аснове. Мы ведаем выпадкі, калі дзеці пасля нашых спаборніцтваў траплялі на аловак трэнерам.

Як прызнаўся Аляксандр Васільевіч, выдатныя вынікі ў жаночым біятлоне, лыжных гонках, стральбе павінны паспрыяць таму, каб дзеці яшчэ больш цікавіліся гэтымі дысцыплінамі і паспрабавалі сябе праявіць у спаборніцтвах «Снежны снайпер».

— Удзельнікі нашых стартаў выдатна ведаюць беларускіх спартсменаў, уважліва сочаць за іх выступленнямі. Яны для дзяцей — куміры. Дзякуючы менавіта іх дасягненням, многія і пачалі займацца лыжнымі гонкамі ці стральбой. Гэтым разам павіншаваць прызёраў прыйшлі лыжнік Сяргей Далідовіч, біятланістка Алена Зубрылава і алімпійскі чэмпіён па кулявой стральбе Сяргей Мартынаў.

Дарэчы, абсалютнымі пераможцамі сёлетніх стартаў сталі прадстаўнікі Магілёўскай вобласці, якія атрымалі вікторыю і ў дарослай, і ў малодшай узроставых групах.

**Тарас ШЧЫРЫ.**





Фота Надзеі БУЖАН.

■ Меркаванне

# АМЕРЫКАНСКІ ІНТАРЭС ВА УКРАІНЕ



**Падзеі ва Украіне сталі сюрпрызам для многіх. Але калі паглядзець на публікацыю амерыканскага палітолага Джорджа Фрыдмана ад 11 лютага на сайце Stratfor, амерыканскай прыватнай разведвальна-аналітычнай кампаніі, якая выйшла пад красамоўнай назвай «Новыя вектары знешняй палітыкі ЗША ў кірунку да Расіі», тое, што адбылося ў далейшым, ужо цяжка назваць непрадбачаным або празмерна дзіўным.**

Джордж Фрыдман адзначае, што на працягу некалькіх апошніх гадоў знешняя палітыка ЗША стала перажываць трансфармацыю. Раней яна была засяроджана ў асноўным на ісламскім свеце і, што больш важна, як правіла, прадугледжвала выкарыстанне сілы ў якасці ранняга варыянта, а не ў якасці апошняга аргумента. Але ваенная сіла мае істотныя абмежаванні. Таму адбыўся пераход да новай стратэгіі, пры якой ЗША выкарыстоўвае натуральныя расколы і супярэчнасці, што існуюць у кожным рэгіёне, каб блакіраваць з'яўленне рэгіянальных гегемонаў і груп, якія могуць пагражаць інтарэсам ЗША.

Лепшым прыкладам ранейшай палітыкі з'яўляецца Лівія, дзе Злучаныя Штаты непасрэдна ўмяшаліся пры дапамозе ваенна-паветраных сіл і сіл спецыяльных аперацый, каб звергнуць Муамара Кадафі. Спроба замяніць яго рэжымам, спрыяльным для Злучаных Штатаў і іх саюзнікаў, так і не ўдалася. Новую стратэгію можна ўбачыць у Сірыі, дзе замест прамога ўмяшання ЗША здалі назад і дазволілі варожым групоўкам расходаваць сваю энергію адна на адну, прадухіляючы любы бок ад адцягнення рэсурсаў на дзейнасць, якая можа кінуць выклік інтарэсам ЗША.

Амерыканскі палітолаг адзначае, што Расія стала праблемай для Злучаных Штатаў пасля аранжавай рэвалюцыі ў 2004 годзе, калі ЗША, падтрымліваючы антырасійскія групоўкі ва Украіне, удалося прывесці да ўлады антырасійскі ўрад. Расіяне расцанілі гэта як аперацыю амерыканскай разведкі, накіраваную на стварэнне антырасійскай Украіны, што напрамую аспрэчвае расійскія стратэгічныя і эканамічныя інтарэсы. Больш за тое, Масква ўбачыла аранжавую рэвалюцыю (нараўне з рэвалюцыяй руж) у якасці генеральнай рэпетыцыі таго, што можа адбыцца ў Расіі ў далейшым.

Адказам Расіі стала выкарыстанне сваіх уласных магчымасцяў у «паддыванавай» гульні, у спалучэнні з эканамічным ціскам праз выкарыстанне прыроднага газу. Гэтыя крокі (а таксама расчараванне ў заходняй дапамозе) дазволілі больш прарасійскаму ўраду з'явіцца ў Кіеве, што знізіла апасенні расіян і павысіла іх упэўненасць у сабе. Гэта таксама дазволіла Маскве стаць больш эфектыўнай і пачаць удзельнічаць у геапалітычнай гульні на Блізкім Усходзе.

На думку Фрыдмана, рашэнне Злучаных Штатаў пайсці па тым жа шляху ва Украіне, як было і з аранжавай рэвалюцыяй 2004 года, звязана з няўпэўненасцю ЗША ў тым, што ЕС зможа блакіраваць Расію самастойна. Той тып інтэрвенцыі, што сталі выкарыстоўваць ЗША, нацэлены на мінімальныя выдаткі пры спробе змены рэжыму ва Украіне. ЗША аказвалі фінансавую і псіхалагічную падтрымку дэманстрантам, якія пратэставалі супраць рашэння ўкраінскага прэзідэнта аб адмове ад больш цесных адносін з Еўропай, і абураліся спробам урада падавіць дэманстрацыі.

Выкарыстанне дэманстрантаў супраць Януковіча мела дзве мэты. Першая — стварыць рэальны стратэгічны выклік для Расіі і прымусіць яе сысці ў глухую абарону. Па-другое, нагадаць Расіі, што ў Вашынгтона ёсць магчымасці і рэсурсы, праз наяўнасць якіх кідаць выклік ЗША цяжка. Дадатковым выйгрышам было ўздзеянне на цэнтральнаеўрапейскія дзяржавы, ад Польшчы да Румыніі, ствараючы ўражанне вяртання ЗША ў рэгіён як альтэрнатывы Германіі і Расіі.

На думку Фрыдмана, новая стратэгія ЗША ва Украіне з'яўляецца бліскучым ходам. Ён адзначае, што нават пройгрыш у прыходзе да ўлады ва Украіне празаходняга ўрада таксама будзе мець плюсы. У любым выпадку гэта будзе напамінкам Расіі, што ЗША зноў у гульні на постсавецкай прасторы і Расіі трэба думаць, дзе ЗША нанясуць наступны ўдар на яе перыферыі. Таксама гэта створыць непаразуменні паміж цэнтральнаеўрапейскімі краінамі і Германіяй, што таксама на руку ЗША.

Як нам вядома цяпер, праз месяц пасля апублікавання артыкула Фрыдмана новая стратэгія ЗША не дала асечкі. Ва Украіне прыйшоў да ўлады празаходні ўрад. Але Расія адмовілася дзейнічаць так пасіўна, як гэта было пасля аранжавай рэвалюцыі 2004 года. І «бліскучы ход ЗША» ў чарговы раз стварыў нашмат больш праблем, чым пазітыву і для саміх амерыканцаў, і для сусветнай супольнасці.

Зрэшты, а хіба было інакш з уварваннем у Ірак у 2003 годзе або падтрымкай «арабскай вясны»? Вынікам гэтых неабдуманых крокаў ЗША стаў такі віток нестабільнасці ў свеце, што амерыканскія стратэгі ўжо і не ведаюць, як расхлёбваць завараную там кашу. І лепш бы яны ламалі галаву над гэтым, чым неабдумана апрабоўвалі нешта новае ў цэнтры Еўропы.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

## ЗБРОЯ Ў ЛЕСАПАЛАСЕ

**Пачуўшы па радыё пра тое, што праводзіцца мерапрыемства па добраахвотнай здачы зброі «Арсенал», жыхар Партызанскага раёна сталіцы прынёс у міліцыю дзве гладкаствольныя паляўнічыя стрэльбы.**

Паводле яго слоў, зброю ён выпадкова знайшоў у лесапаласе па дарозе ў сталіцу. Вяртаючыся з сям'ёй пасля выхадных, выйшаў на ўзбочыну дарогі і заўважыў скрутак з цёмнай тканіны. Акуратна разгарнуў яго, а там — дзве стрэльбы. Гэтая зброя аказалася незарэгістраванай і будзе знішчана. Падчас правядзення мерапрыемства на тэрыторыі раёна добраахвотна здадзена 14 адзінак зарэгістраванай зброі. 7 чалавек прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, дазвол на нашэнне зброі ў іх анулюецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 17 апреля 2014 года**
**проводит 6-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности.**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка, (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 72 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.107910039 дв.996640 1979г. 4 кат. 1871км КР-1994г | г.Дзержинск в/ч 74962 | 230 000 000 | 23 000 000 |
| 73 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.107909024 дв.585390 1979 г. 4 кат. 1665 км | г.Дзержинск | 280 000 000 | 28 000 000 |
| 74 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.107907019 дв.580339 1979 г. 4 кат. 5900км | в/ч 74962 | 250 000 000 | 25 000 000 |
| 75 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108011024 дв.676670 1980г. 4 кат. 1850км | г.Дзержинск | 280 000 000 | 28 000 000 |
| 76 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108002024 дв.610819 1980г. 4 кат. 1850км | в/ч 74962 | 280 000 000 | 28 000 000 |
| 77 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108004019 дв.62461 1980г. 4 кат. 1816км | г.Дзержинск | 280 000 000 | 28 000 000 |
| 78 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108001018 дв.б/н 1980г. 4 кат. 4121км | в/ч 74962 | 250 000 000 | 25 000 000 |
| 79 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.107912006 дв.608052 1979 г. 4 кат. 4630км | г.Дзержинск | 250 000 000 | 25 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г.Минск, ул.Казинца, д.2, 6-й этаж **17 апреля 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 часов 14 апреля 2014 года.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-ех дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

***Извещение о проведении аукциона, опубликованное в газете «Звязда» от 07.03.2014 № 43 считать недействительным.***

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1,2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул.Щорса-пр.Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». (4 пусковой комплекс) в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 21 мая 2013 года:

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить, на строительство квартир № 51, № 56, № 104.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ с оплатой в течение 3-х месяцев в текущих ценах составляет:

2-комнатные квартиры – 14 567 133 руб.

При условии оплаты 100% стоимости жилого помещения в течение 10 банковских дней с даты регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, стоимость 1 кв. метра общей площади жилых помещений составит:

2-комнатные квартиры – 14 038 559 руб.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул.К.Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

**Генеральный директор** ***Н.В.Милошевский***

*УНП 100071325*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта **«Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 36 по генплану** в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 31 декабря 2013 года:

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 8, № 12, № 16, № 20, № 24, № 28, № 32, № 36, № 40, № 50, № 54, № 58, № 62, № 66, № 70, № 74, № 78 с учетом выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет:

15 085 929 руб. – на 1-комнатные квартиры;
13 648 857 руб. – на 3-комнатные квартиры.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

**Генеральный директор** ***Н.В.Милошевский***

*УНП 100071325*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта **«Многоэтажный жилой дом неповышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная Горка-3» (жилой дом),** опубликованную в газете «Звязда» от 10 мая 2013 года № 85 (27450):

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 204, № 214, № 224, № 234, № 244 без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет 12 518 912 руб.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул.К.Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

**Генеральный директор** ***Н.В.Милошевский***

*УНП 100071325*

**ОТЧЕТ**

**Местного фонда «Центр содействия развитию и предпринимательству Белоозерского сельсовета» об использовании своего имущества за 2013 год.**

Количество учредителей Фонда — 4, в том числе 4 физических лица.
Стоимость имущества Фонда, в том числе:
основные средства 2190000,00 рублей,
иные поступления 36598239 рублей.

**Директор** **А.Н. Белецкий**

*УНП 290927292*

■ Блізкая ўлада

# «ПАДТРЫМАЙЦЕ МОЙ ПРАЕКТ!»

## На «прамую лінію» да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна Сумара за вечар дазваніліся 39 жыхароў вобласці

**Адметнай рысай сакавіцкага дыялогу можна назваць той факт, што ў шэрагу скаргаў і пытанняў было нямала канкрэтных прапаноў па паляпшэнні якасці жыцця рэгіёна. Дазваніліся людзі, што маюць канкрэтныя праекты, рэалізацыя якіх на практыцы дасць значны эканамічны эфект. Так, прынамсі, сцвярджалі тэлефонныя абаненты. І прапановы іх выклікалі цікавасць у кіраўніка рэгіёна.**



Прадпрымальнік Мікалай Варатнікоў мае намер зрабіць Жабінкаўскі раён пляцоўкай па ўкараненні энергазберагальнай праграмы. Тым больш што ў яго ёсць пэўныя напрацоўкі. На базе Жабінкаўскага камбікормавага завода прадпрыемства Мікалая Варатнікова паспяхова апрабавала ўстаноўку па выкарыстанні альтэрнатыўных відаў паліва. У справу пайшлі адходы камбікормавай вытворчасці, якія раней проста закопваліся ў зямлю. Сёння бізнесмен распрацаваў цэлую праграму выкарыстання падобнай сыравіны для атрымання энергіі. І прасіў не столькі фінансавай, колькі маральнай і арганізацыйнай падтрымкі.

Другі абанент рэкамендаваў свайго калегу, вучонага з Санкт-Пецярбурга, які мае распрацоўкі, цікавыя для Брэсцкага электралямпавага завода. Укараненне яго ноу-хау, на думку брастаўчаніна, прынясе прадпрыемству немалы валютны прыбытак. Пасля размовы з рацыяналізатарамі былі запісаны іх каардынаты і прызначаны кампетэнтныя спецыялісты з аблвыканкама, якія сустрэнуцца з людзьмі і вывучаць пытанне.

Усеагульную ўсмешку прысутных выклікаў званок ветэрана меліярацыйнай справы Міхаіла Басюка з Пінска. Але ж чалавек гаварыў пра тое, што для яго важна, і было відаць, што на лініі — патрыёт сваёй прафесіі. Міхаіл Пятровіч прасіў, каб падчас святкавання абласных дажынак восенню гэтага года ў Пінску ў праграму канцэрта абавязкова ўключылі гімн меліяратараў. Пенсіянер падрабязна патлумачыў, дзе апублікаваны тэкст і ноты названага твора. Губернатар падзякаваў ветэрану за актыўную жыццёвую пазіцыю, паабяцаў просьбу выканаць і не без гумару дадаў, што калі Пінскі раён сёлета намалоціць 100 тысяч тон збожжа, то ён асабіста выканае гэтую песню са сцэны. Беручы да ўвагі добрыя вакальныя даныя Канстанціна Сумара, не даводзіцца ў тым сумнявацца...

Як заўсёды, падчас «прамой лініі» прагучала нямала просьбаў з Брэста, Пінска, Баранавіч наконт пракладкі камунікацый у раёнах індывідуальнай жылой забудовы. Жыхарка аграгарадка Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна прасіла паскорыць гэту работу, тым больш што кааператыў іх забудоўшчыкаў вельмі многа зрабіў за свой кошт. Пасля правядзення «прамой лініі» на невялікім брыфінгу для журналістаў кіраўнік вобласці адзначыў як станоўчы факт наяўнасць такіх зваротаў. Яны сведчаць аб тым, што людзі актыўна будуюцца, пераадольваючы цяжкасці з атрыманнем крэдытаў, падаражання будаўнічых матэрыялаў, і тым самым закладваюць аснову будучага дабрабыту сям'і. Паводле слоў губернатара, усяляе аптымізм і тое, што забудоўшчыкі не толькі просяць падтрымкі дзяржавы, але і выказваюць гатоўнасць удзельнічаць у фінансаванні асобных камунікацый на агульную карысць. Адзначыў Канстанцін Сумар і станоўчасць такіх зваротаў, што датычыцца будаўніцтва садкоў і школ. Значыць, растуць сем'і, нараджаюцца дзеці, калі патрабуюцца месцы ў садках і школах.

На «прамую лінію» дазванілася жыхарка брэсцкага мікрараёна Вулька, заклапочаная тэмпамі будаўніцтва школы ў іх мікрараёне. Маці дваіх дзяцей атрымала адказ, што пакуль усё ідзе па плане. А планам прадугледжана адкрыццё трэцяй школы на Вульцы першага верасня гэтага года.

Другая мама дваіх дзяцей скардзілася на нязручнасці медыцынскага абслугоўвання ў іх раёне. За рознымі аналізамі і, хай невялікімі, абследаваннямі для дзяцей даводзіцца звяртацца ў дзве розныя паліклінікі. Ці нельга працэс медыцынскага абслугоўвання дзяцей звесці ў адно, пыталася брастаўчанка. Гэтую заяўніцу запрасілі на адкрыццё новай дзіцячай паліклінікі, запланаванае на 3 ліпеня. Тады і яна, і іншыя мамы гэтай часткі горада змогуць уздыхнуць з палёгкай.

| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 892 | 1 892 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | | |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | 13 | |
| Резервный капитал | 440 | 217 | 217 |
| Добавочный капитал | 450 | 8 981 | 8 213 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 6 134 | 5 293 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | |
| Целевое финансирование | 480 | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 17 211 | 15 615 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 2 492 | 316 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 1 110 | 1 209 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | | |
| Доходы будущих периодов | 540 | | |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | | |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 3 602 | 1 525 |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 3 257 | 2 876 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 118 | 103 |
| по авансам полученным | 632 | 688 | 426 |
| по налогам и сборам | 633 | 278 | 175 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 287 | 265 |
| по оплате труда | 635 | 752 | 828 |
| по лизинговым платежам | 636 | | |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 21 | 24 |
| прочим кредиторам | 638 | 1 113 | 1 055 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | |
| Доходы будущих периодов | 650 | | |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 3 257 | 2 876 |
| БАЛАНС | 700 | 24 070 | 20 016 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2013 года

| Наименование показателя | Коды строк | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 35 390 | 38 605 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 24 258 | 27 729 |
| Валовая прибыль | 030 | 11 132 | 10 876 |
| Управленческие расходы | 040 | 5 380 | 4 260 |
| Расходы на реализацию | 050 | 3 604 | 3 212 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 2 148 | 3 404 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 3 651 | 3 011 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 4 751 | 3 763 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 1 048 | 2 652 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 25 | 123 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | | 21 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | | |
| проценты к получению | 103 | | |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 25 | 102 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 3 | 41 |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | | 2 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | 3 | 39 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 75 | 89 |
| в том числе: курсовые разницы от перерасчета активов и обязательств | 121 | 73 | 87 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 2 | 2 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 126 | 125 |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | 124 | 78 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 2 | 47 |
| Иные доходы и расходы | 140 | | |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | -29 | 46 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 160 | 1 019 | 2 698 |
| Налог на прибыль | 170 | 322 | 586 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 180 | | |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | | |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 697 | 2 112 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 912 | 1 620 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | | |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 1 609 | 3 732 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 43 087 | 89 283 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | | |

| Наименование показателя | Коды строк | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|
| **ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ** | | | |
| Наименование показателя | Ед. измер. | | |
| Количество акционеров, всего | лиц | 709 | 705 |
| В том числе: юридических лиц | лиц | 9 | 9 |
| Физических лиц | лиц | 700 | 696 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 0 | 0 |
| Дивиденды, приходящиеся к выплате на одну акцию | руб. | 0 | 0 |
| Обеспеченность акций имуществом общества | тыс. руб. | 659,22 | 727,58 |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за январь-декабрь 2013 года

| Наименование показателей | Код стр. | Уставный капитал | Неоплаченная часть уставного капитала | Собственные акции (доли в уставном капитале) | Резервный капитал | Добавочный капитал | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | Чистая прибыль убыток) | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| Остаток на 31.12.2011 г. | 010 | 1 892 | | | 217 | 6 593 | 3 607 | | 12 309 |
| Корректировка в связи с изменением учетной политики | 020 | | | | | | | | |
| Корректировки в связи с исправлением ошибок | 030 | | | | | | | | |
| Скорректированный остаток на 31.12.2011 г. | 040 | 1 892 | | | 217 | 6 593 | 3 607 | | 12 309 |
| За январь-декабрь 2012 года Увеличение собственного капитала | 050 | | | | | 4 104 | 2 112 | | 6 216 |
| В том числе: чистая прибыль | 051 | | | | | | 2 112 | | 2 112 |
| переоценка долгосрочных активов | 052 | | | | | 4 104 | | | 4 104 |
| доходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 053 | | | | | | | | |
| выпуск дополнительных акций | 054 | | | | | | | | |
| увеличение номинальной стоимости акций | 055 | | | | | | | | |
| вклады собственника имущества (учредителей, участников) | 056 | | | | | | | | |
| реорганизация | 057 | | | | | | | | |
| | 058 | | | | | | | | |
| | 059 | | | | | | | | |
| За январь-декабрь 2012 года Уменьшение собственного капитала – всего | 060 | | | | | 2 484 | 426 | | 2 910 |
| В том числе: убыток | 061 | | | | | | | | |
| переоценка долгосрочных активов | 062 | | | | | 2 484 | | | 2 484 |
| расходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 063 | | | | | | | | |
| уменьшение номинальной стоимости акций | 064 | | | | | | | | |
| выкуп акций (долей в уставном капитале) | 065 | | | | | | | | |
| дивиденды и другие доходы от участия в уставном капитале организации | 066 | | | | | | 25 | | 25 |
| реорганизация | 067 | | | | | | | | |
| | 068 | | | | | | 401 | | 401 |
| | 069 | | | | | | | | |
| Изменение уставного капитала | 070 | | | | | | | | |
| Изменение резервного капитала | 080 | | | | | | | | |
| Изменение добавочного капитала | 090 | | | | | | | | |
| Остаток на 31.12.2012 г. | 100 | 1 892 | | | 217 | 8 213 | 5 293 | | 15 615 |
| Остаток на 31.12.2012 г. | 110 | 1 892 | | | 217 | 8 213 | 5 293 | | 15 615 |
| Корректировки в связи с изменением учетной политики | 120 | | | | | | | | |
| Корректировки в связи с исправлением ошибок | 130 | | | | | | | | |
| Скорректированный остаток на 31.12.2012 г. | 140 | 1 892 | | | 217 | 8 213 | 5 293 | | 15 615 |
| За январь-декабрь 2013 года Увеличение собственного капитала | 150 | | | | | 2 464 | 697 | | 3 161 |
| В том числе: чистая прибыль | 151 | | | | | | 697 | | 697 |
| переоценка долгосрочных активов | 152 | | | | | 2 464 | | | 2 464 |
| доходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 153 | | | | | | | | |
| выпуск дополнительных акций | 154 | | | | | | | | |
| увеличение номинальной стоимости акций | 155 | | | | | | | | |
| вклады собственника имущества (учредителей, участников) | 156 | | | | | | | | |
| реорганизация | 157 | | | | | | | | |
| | 158 | | | | | | | | |
| | 159 | | | | | | | | |
| За январь-декабрь 2013 года Уменьшение собственного капитала – всего | 160 | | | 13 | | 1 552 | | | 1 565 |
| В том числе: убыток | 161 | | | | | | | | |
| переоценка долгосрочных активов | 162 | | | | | 1 552 | | | 1 552 |
| расходы от прочих операций, не включаемые в чистую прибыль (убыток) | 163 | | | | | | | | |
| уменьшение номинальной стоимости акций | 164 | | | | | | | | |
| выкуп акций (долей в уставном капитале) | 165 | | | 13 | | | | | 13 |
| дивиденды и другие доходы от участия в уставном капитале организации | 166 | | | | | | | | |
| реорганизация | 167 | | | | | | | | |
| | 168 | | | | | | | | |
| | 169 | | | | | | | | |
| Изменение уставного капитала | 170 | | | | | | | | |
| Изменение резервного капитала | 180 | | | | | | | | |
| Изменение добавочного капитала | 190 | | | | | -144 | 144 | | |
| Остаток на 31.12.2013 г. | 200 | 1 892 | | -13 | 217 | 8 981 | 6 134 | | 17 211 |
| Прибыль, использованная на капитальные вложения в текущем году | 201 | | | | | | | | |

**Руководитель** **Кудрицкий С.И.**
**Главный бухгалтер** **Ловгач Н.В.**
**21.02.2014**

**Ігуменскі тракт**
№ 7 (65)

■ Дух вандраванняў

# РАКА ЧАСУ, альбо Па Віліі шляхамі Канстанціна Тышкевіча

**Горад Вілейка — цудоўны куточак Беларусі. Драўляныя домы суседнічаюць з новымі забудовамі, ветлівыя жыхары заўсёды падкажуць дарогу. Горад стаіць на рацэ Вілія, якая зачароўвае сваёй прыгажосцю і запрашае зазірнуць углыб стагоддзяў. Некалі, а дакладней у 1857 г., па яе водах здзейсніў падарожжа Канстанцін Тышкевіч. У гонар гэтай падзеі ў Вілейцы быў адкрыты помнік і арганізавана вандроўка па маршруце вядомага навукоўца.**

## Экскурс у гісторыю

5 чэрвеня 1857 года шмат людзей сабралася ў вёсцы Каменка каля моста цераз Вілію. На вадзе калыхалася цэлая флатылія, падрыхтаваная да плавання. Усе 5 суднаў былі пабудаваны Канстанцінам Тышкевічам.



*Канстанцін Тышкевіч — (5 (17) лютага 1806 г., Лагойск — 1 (13) ліпеня 1868 г., Мінск) — беларускі гісторык, археолаг, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі. Належыў да шляхецкага роду Тышкевічаў. Нарадзіўся ў родавым маёнтку Лагойск у сям'і буйнога землеўласніка. На аснове ўласных калекцый разам з бацькам і братам стварыў Лагойскі музей старажытнасцяў. Займаўся археалагічнымі раскопкамі — даследаваў каля 200 курганоў, гарадзішчаў і замчышчаў у Мінскай губерні.*

У склад экспедыцыі, апрача самаго Канстанціна Тышкевіча, уваходзілі землямер Ежы Шантыр і мастак Марцэлій Янушэвіч, які рабіў замалёўкі ў падарожны альбом. На працу чатырох месяцаў навуковая экспедыцыя даследавала ўсю Вілію — ад Каменскага моста да вусця. Гэта ўнікальнае падарожжа легла ў аснову кнізе К. Тышкевіча «Вілія і яе берагі».

## Не плач, Вільяна

Не дзіўна, што ў гонар той славутай экспедыцыі ў Вілейцы быў адкрыты памятны знак.

— Помнік з'явіўся ў 2007 годзе, калі праводзілася беларуска-літоўская міжнародная экспедыцыя, якая называлася «Шляхам графа Тышкевіча праз паўтара стагоддзя», — распавядае старшы навуковы супрацоўнік Вілейскага краязнаўчага музея Вольга Каласава. — Быў усталяваны шэры валун з мемарыяльнай дошкай, на якой адлюстраваны шлях, што прайшоў Канстанцін Тышкевіч. Праз год на гэтым камні з'явілася Вільяна, сімвал нашай ракі. Аўтарам скульптуры з'яўляецца Уладзімір Слабодчыкаў. Чаму менавіта Вільяна? Там, дзе рака бярэ пачатак (у Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці), ляжыць знакаміты Сцёп-камень. Ён звязаны з легендай пра Сцяпана і Вільяну. Даўным-даўно жыў кравец Сцяпан, і была ў яго прыгожая маладая жонка, якую звалі Вільяна. Сцяпан вельмі шмат працаваў, і не было яму часу нават у царкву схадзіць. Калі ўсе людзі пайшлі ў царкву на Вялікдзень, ён зноў застаўся дома і шыў. Бог яго пакараў: ператварыў у вялікі валун. Але здарыўся цуд: гэты камень далей працягваў шыць. Людзі прыносілі тканіну, клалі яе каля каменя і казалі, што ім трэба. Ноччу Сцяпан ператвараўся ў чалавека і выконваў заказы. Але аднойчы да Сцёп-каменя падышоў чалавек, які вырашыў пажартаваць са Сцяпана, паклаў тканіну каля валуна і кажа: «Пашый мне ні тое, ні сёе». Сцяпан вельмі пакрыўдзіўся. З таго часу ён перастаў шыць і канчаткова акамянеў. Калі Вільяна пераканалася, што яе Сцяпан больш не будзе ператварацца ў чалавека, яна ўпала на камень, абняла яго, пачала плакаць. Слёзы яе цяклі вельмі доўга: спачатку ўтварыўся ручаёк, пасля рака. Вось такая прыгожая легенда. — Кожны год, у канцы жніўня, у нас праводзіцца свята Вільяны, або Сцяпана...

## Вілія = Нярыс

Першая экспедыцыя «Шляхам Канстанціна Тышкевіча» адбылася ў 2007 годзе. Удзельнікаў было каля 300 чалавек. Усім вельмі спадабалася, таму было вырашана арганізоўваць экспедыцыю кожны год. Паўдзельнічаць у ёй можа кожны ахвотны — з гэтым можна звяртацца да супрацоўнікаў вілейскага краязнаўчага музея. Экспедыцыя пачынаецца прыкладна 2 — 3 ліпеня і працягваецца каля двух тыдняў. Усе ўдзельнікі садзяцца на лодкі, у каго якая ёсць, — і наперад. Ці назад — па стужцы часу. Таму што спыняюцца ў тых мясцінах, якія калісьці наведваў Канстанцін Тышкевіч. Цікава прыгадаць, што сам навуковец падчас стаянак заўсёды рабіў мясцовым жыхарам падарункі: кабетам — хустачкі, маладым дзяўчатам — пацеркі, дзецям — цукеркі. Таму сустракаць графа Тышкевіча збіралася ўся вёска.

— Ініцыятарам першай экспедыцыі быў цудоўны чалавек, сапраўдны турыст Віталь Кастэнка, — распавядае Вольга Аляксандраўна. — Яго ідэю падтрымалі ўсе: і мясцовыя ўлады, і турысты, і краязнаўчы музей. Рака Вілія нясе свае воды ў Балтыйскае мора, каля Каўнаса ўпадае ў Нёман. Літоўцы раку Вілію называюць Нярыс. У нас з літоўцамі вельмі добрыя стасункі, нягледзячы на тое, што нас раз'ядноўвае мяжа. Наша вандроўка пачалася ад вёскі Каменка, як і 150 гадоў таму. У экспедыцыі ўдзельнічалі археолагі, этнографы. Праводзіліся невялікія археалагічныя раскопкі, этнолагі апытвалі мясцовае насельніцтва, можна казаць, што гэта была сапраўдная навуковая экспедыцыя. У вёсках, мястэчках нас сустракалі вельмі добра — ладзіліся канцэрты, іншыя культурныя мерапрыемствы. Хапала і рамантыкі палявога жыцця. Прыгажосць адкрываецца незвычайная, калі плывеш па рацэ, — такога ніколі не пабачыш падчас пешых вандровак. Удзельнікі экспедыцыі былі розных узростаў — ад 4 да 70 гадоў, некаторыя вандравалі сем'ямі. Праз год была арганізавана другая экспедыцыя, пасля трэцяя і так далей. Не збіраемся спыняцца і будзем рады новым удзельнікам.



**Надзея ЕМЯЛЬЯНАВА**

■ Працяг тэмы

# НАЗВЫ І ТАБЛІЧКІ ПА-БЕЛАРУСКУ. АДЗІНАГАЛОСНА

**Спрэчкі вакол унясення змен у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў» дагэтуль не сціхаюць. Трэба адзначыць, што ў адказныя за гэта інстанцыі прыйшло мноства зваротаў грамадзян з тым, каб ніякіх змен у гэты закон не ўносіць, бо ён і так дасканалы, прыняты зусім нядаўна, у 2010 годзе. Аднак з-за скаргаў некаторых мясцовых органаў улады, якія прыйшлі ў вышэйшыя службовыя інстанцыі, прынята рашэнне ўсё ж унесці змены. Засталося толькі вырашыць, якія канкрэтна.**

Кансультант упраўлення па геадэзіі і картаграфіі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Ірына БАРОДЗІЧ расказала, чым абумоўлена неабходнасць такіх перамен:

— Закон дзейнічае з 2011 года і ўяўляе сабой новую эпоху ў развіцці нашай краіны. Беларуская мова перайшла на іншы ўзровень, яе можна бачыць на паказальніках з назвамі гарадоў і мястэчак, у афіцыйных лістах. Аднак з таго часу, як пачаў дзейнічаць закон, мясцовыя органы кіравання не да канца яго ўспрымалі, а часам нават не ведалі, што такі прыняты, — і працягвалі даваць назвы па-руску. Дзяржкамітэт праводзіў навучанне, ладзіў выязныя семінары, каб прызвычаіць прадстаўнікоў раённай і абласной улады правільна даваць назвы на роднай мове. Аднак там не заўсёды ўспрымалі інфармацыю. Адсутнасць дыялогу прывяла да таго, што мясцовыя ўлады ўвогуле не хацелі ўспрымаць транслітарацыю і разумець яе прынцыпы. Выказвалі думку, што яна псуе рускую мову. Са сваімі скаргамі яны звярнуліся ў вышэйшыя інстанцыі. Таму было дадзена даручэнне ўнесці змены, у прыватнасці, у 17 артыкул, якія б дапускалі прамы пераклад з беларускай мовы на рускую. Гэта фактычна перакрэсліла б усю нашу працу, зробленую за час дзейнасці закона, а таксама шматгадовыя старанні тых, хто стварыў 6-томны даведнік з беларускімі назвамі, транслітараванымі на рускую, а таксама напісанымі лацінкай. Гэта даручэнне, мы абавязаны яго выканаць, аднак якія канкрэтна новаўвядзенні будуць прыняты, яшчэ вырашаецца.

«Звязда» ўжо пісала аб праекце змяненняў і дапаўненняў у дзейны закон, які распрацаваў дзяржаўны камітэт па маёмасці. Рэспубліканская тапанімічная камісія пры Акадэміі навук Беларусі, якая мінулы праект закона не ўхваліла, з гэтым па большасці палажэнняў згодная. Аднак члены камісіі яшчэ раз сабраліся на грамадскае абмеркаванне, каб выказаць сваю канчатковую пазіцыю адносна таго, што хутка будзе прынята на заканадаўчым узроўні, і пастарацца яшчэ неяк паўплываць на гэты працэс. Старшыня камісіі Ігар КАПЫЛОЎ напрыканцы пасяджэння, пачуўшы і адзначыўшы ўсе меркаванні, агучыў рэзалюцыю з шасці пунктаў. Яна прысутнымі была падтрымана адзінагалосна:

**1. Найменні геаграфічным аб'ектам даюцца на беларускай мове.** З беларускай мовы перадаюцца на рускую, а таксама на іншыя мовы. Нязгоду прысутных выклікаў пункт у праекце, дзе гаварылася, што на іншыя мовы назвы могуць перадавацца як з беларускай, так і з рускай моваў. Усе выказаліся, што такі падыход непрымальны: трэба, каб замежныя адпаведнікі рабіліся з роднай мовы.

**2. Пры распрацоўцы правіл спосабаў перадачы найменняў з беларускай мовы на рускую рэкамендаваць Дзяржкамітэту па маёмасці выкарыстоўваць у якасці асноўных спосабы транслітарацыі і практычнай транскрыпцыі.** Па гэтым пытанні думкі спецыялістаў разышліся. Хтосьці адзначаў, што трэба прапісаць таксама, што ў выключных выпадках можа ўжывацца спосаб прамога перакладу з беларускай мовы. Аднак іншыя ўпэўнена сцвярджалі, што, калі заканадаўча прапісаць такую магчымасць, многія захочуць скарыстацца ёй і будуць сцвярджаць, што іх выпадак — выключны. Таму была выказана прапанова, каб у складаных выпадках спецыялісты на месцах звярталіся да прафесіяналаў, збіралі пасяджэнне, дзе ім падказвалі б правільнае рашэнне.

> **З таго часу, як пачаў дзейнічаць закон «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў», мясцовыя органы кіравання не да канца яго ўспрымалі, а часам нават не ведалі, што такі прыняты, — і працягвалі даваць назвы па-руску.**

**3. Найменні геаграфічным аб'ектам на таблічках, дарожных і іншых паказальніках на тэрыторыі Беларусі даюцца на беларускай мове, а таксама, пры неабходнасці, літарамі лацінскага алфавіту.** Такую фармулёўку вывелі на пасяджэнні тапанімічнай камісіі. Аднак у новым законапраекце цяпер прапісана іначай: назвы на паказальніках даюцца на беларускай і рускай мовах, пры неабходнасці, яшчэ і лацінкай. Відавочна, што прапанова рабіць трохмоўныя таблічкі — не самая ўдалая. Уявіўшы зрокава такую карціну, бачацца вялізныя, нязграбныя паказальнікі, на якіх будзе занадта шмат інфармацыі. На вялікіх магістралях гэта можа быць нават небяспечным, там і без таго пішуцца назвы некалькіх населеных пунктаў. Павелічэнне інфармацыі ўтрая будзе адцягваць увагу кіроўцы на абдумванне шматслоўных таблічак. Можна ўзгадаць і пра іншы праблемны бок гэтага пытання. Нават сёння, калі назвы пішуцца на адной мове, прадстаўнікам мясцовай улады гэта не заўсёды даецца проста, бо тут патрэбны філалагічныя навыкі. Некаторыя няправільна напісаныя таблічкі выклікаюць часам усмешку, а часам абурэнне. Дык ці варта патрабаваць, каб у такой сітуацыі (калі нават спецыялісты спрачаюцца, якім спосабам перадаваць найменні з беларускай мовы на рускую) усе паказальнікі былі напісаны граматна не тое што на адной мове, але і дасканала перададзены на іншую? Відавочна, што павелічэнне колькасці слоў на інфармацыйных паказальніках павялічыць і колькасць памылак у іх.

Спецыялісты Дзяржкамітэта па маёмасці адзначылі, што яны таксама выступаюць за тое, каб таблічкі пісаліся толькі па-беларуску, пры неабходнасці, яшчэ і лацінкай. Так было б і правільна, і рацыянальна. Аднак да іх звярнуліся з Мінаблвыканкама з патрабаваннем дазволіць рабіць таблічкі яшчэ і на рускай мове. Гэта здзіўляе, асабліва ўлічваючы тое, што якраз у беларускай сталіцы сёння шмат паказальнікаў на роднай мове. А на тое, што робіцца ў сталіцы, як вядома, часта арыентуюцца і іншыя рэгіёны.

**4. Увесці ў практыку сумеснай работы Дзяржаўнага камітэта па маёмасці і Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі правядзенне пастаянных семінараў з адказнымі службамі мясцовых органаў кіравання, на якіх будзе праводзіцца навукова-кансультацыйная работа па ўкараненні палажэнняў закона ў практыку.** Гэта для таго, каб патлумачыць, што такое транслітарацыя і практычная транскрыпцыя. Насамрэч нічога незразумелага і складанага за гэтымі словамі не хаваецца. Яны азначаюць палітарную перадачу назвы, улічваючы спецыфіку іншай мовы.

**5. Распрацаваць комплекс мерапрыемстваў па папулярызацыі ўнесеных змен у дзейнае заканадаўства ў сродках масавай інфармацыі і сістэме адукацыі.** Закон, прыняты ў 2010 годзе, нават без дапаўненняў даволі дасканалы. Калі некаторыя аспекты і зменяцца, ён варты таго, каб яго ведалі і ім карысталіся на практыцы.

**6. Запрасіць на пасяджэнне дзяржаўных органаў улады, якія будуць разглядаць прапанаваны праект змен і дапаўненняў, старшыню Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі.** Практыка паказвае, што часам прапановы, якія грамадскасцю прымаюцца адзінагалосна, у вышэйшых органах улады да ўвагі не прымаюцца. Таму патрэбен той, хто данясе важную і абгрунтаваную думку.

Праект зменаў у закон «Аб геаграфічных найменнях», якія распрацавалі спецыялісты Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, ужо ўхвалены большасцю інстанцый. Таму пасяджэнне Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі крыху спазнілася, яно мела б нашмат большую карысць некалькі месяцаў таму. Рэзалюцыя будзе накіравана ў адказныя за прыняцце закона ўстановы, але хутчэй за ўсё як інфармацыйны ліст: «Адбылося такое-та пасяджэнне, дзе вырашана...» Аднак пакуль змены ў закон яшчэ не прыняты, справу нельга лічыць завершанай.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Традыцыі і сучаснасць

# СПЕВЫ НА «ВЯСЕЛЛІ» ад фальклорнага гурта GUDA

**Вясна пачынаецца з гукаў кахання і натхнення. Першае і другое выдатна спалучаюцца ў жыцці. Рамантычныя, узнёслыя пачуцці злучаюць людзей у сем'і. Ад шчасця душа спявае, хочацца радавацца, танчыць і дзяліцца сваімі пачуццямі з іншымі. Як гэта было ў нашых продкаў, прадэманстраваў фальклорны гурт GUDA, які на пачатку сакавіка ў Маладзёжным тэатры эстрады прадставіў новы альбом пад назвай «Вяселле» (створаны пры падтрымцы Беларускага народнага банка). Прадставіў — гэта значыць праспяваў. І нават затанчыў. І запрасіў усіх, хто быў на канцэрце, танцаваць і спяваць — гэта як мінімум. Таму што пасля такіх імпрэз павінна нараджацца жаданне наогул прызнацца ў каханні і кагосьці ашчасліўціць у шлюбе.**



guda-group.livejournal.com

Таму што альбом «Вяселле» прадстаўляе нацыянальную традыцыю вясельных спеваў і што адметна, у разнастайнасці рэгіянальнага гучання. Цяпер тым, хто хоча дзень свайго вяселля правесці па-беларуску, стане прасцей: адна справа — займець нацыянальныя строі, засвоіць абрады, але ж трэба яшчэ ведаць, што спяваць і як. А ўдзельнікі гурта GUDA фактычна стварылі дапаможнік: кампакт-дыск разам з песнямі змяшчае апісанне фрагментаў беларускага вясельнага абраду. Хочаце пабрацца шлюбам па-беларуску — вазьміце і асвойвайце...

— Старажытны вясельны абрад робіць свята сакральным, інтымным, глыбокім і не падобным да таго, што можа сёння прапанаваць індустрыя забаваў і пярэстых вечарынак,— адзначае Вікторыя Міхно, спявачка і кіраўніца фальклорнага гурта GUDA. — Цікава, што старадаўнія традыцыі ўсё яшчэ жывыя ў далёкіх ад урбанізаваных асяродкаў вёсках, толькі сталіся яны забытымі і не перадаюцца ад старэйшага пакалення моладзі. Шмат хто лічыць, што да нашых традыцый губляецца павага, губляюцца самі традыцыі, сувязі пакаленняў. Але, на мой погляд, сапраўдныя каштоўнасці ніколі не губляюць сваёй вартасці, а наадварот, толькі набываюць яе з часам. І мы ганарымся, што многія людзі разумеюць гэта.

Гэта трэці альбом гурта, які шчыруе на ніве збірання і вывучэння беларускага фальклору. Але насамрэч усё ідзе ад захаплення, якое вядзе да жадання з гэтым жыць і адкрываць хараство адметнай народнай спадчыны іншым. Сведчанне гэтаму — праца гурта GUDA, які трохі больш за дзесяць гадоў таму прадставіў альбом «Архаічныя абрадавыя спевы», потым быў дыск «Ігры багоў» і супольны праект ZARA разам з гуртом ранняй музыкі Drolls. Але над сваім трэцім сольным альбомам «Вяселле» гурт GUDA працаваў восем гадоў. Ён адметны дзякуючы аўтэнтычным спевам, якія, між іншым, ідуць ад саміх носьбітаў гэтай музыкі, якая жыве дзякуючы пераемнасці ў адной канкрэтнай сям'і. Напрыклад, тры песні ў альбоме разам з удзельніцай гурта Любоўю Сівуравай праспявалі яе маці Сцепаніда Зінкевіч ды цётачка Ганна Краўчук з вёскі Старое Сяло Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

Прэзентацыя альбома стала не толькі дэманстрацыяй беларускай вясельнай песні са сцэны. Гэта быў момант далучэння да народнай культуры праз вясельны абрад — яго праходзілі маладыя людзі, якія вырашылі пабрацца шлюбам. Гэта быў і майстар-клас: магчымасць зразумець і самім паспрабаваць, як танцавалі на беларускіх вясellях (музыку забяспечвалі Аляксей Крукоўскі, Дзяніс Сухі, Вераніка Анцілеўская, Стас Чавус). Гэта было адчуванне духу нашай зямлі праз гукі дуды і скрыпкі ад вядомага музыкі Алеся Лася. Дарэчы, ён разам са сваёй капэлай выконвае інструментальную музыку ў альбоме «Вяселле». Вось так: спачатку захочаш мець альбом, а потым і пра вяселле задумаешся...

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# Вялікі гасцінец Літоўскі

**Байкі кухмістра Верашчакі**

**Так называецца група энтузіястаў, якая аднаўляе атмасферу няспешных падарожжаў па былым Вялікім гасцінцы Літоўскім, які некалі злучаў Варшаву з Гародняй і Вільняй. Па тэрыторыі Польшчы ён ішоў праз Станіславаў, Ліў, Венграў, Сакалоў Падляскі (дзе і месціцца штаб-кватэра віртуальнага гасцінца), Драгічын, Цеханавец, Браньск, Бельск Падляскі, Беласток, Васількаў, Чарну-Беластоцку, Саколку, Кузніцу... Так калісьці ездзілі са сталіцы Рэчы Паспалітай у сеймавую Гародню і літоўскую сталіцу Вільню.**




У Вялікага гасцінца Літоўскага ёсць і кулінарнае вымярэнне, якое злучае кавярні, рэстараны, лакальных вытворцаў, якія даюць магчымасць пакаштаваць смакі, якія некалі адчувалі падарожныя па гасцінцы. У самым канцы 2013 г. выдадзены кулінарны даведнік па гасцінцы, які прадстаўляе гэтыя смакі — ад варшаўскіх рэстарацый у стылі XIX стагоддзя да падляшскіх «заяздуў», у якіх і «літвінская кухня» і татарскія далікатэсы. А таксама славутых людзей, што падарожнічалі Літоўскім гасцінцам, і іх кулінарныя прыхільнасці. Напрыклад, Пілсудскі пэўны час жыў у маёнтку Мілюсін каля Сулеюўка, і побач адкрылася рэстарацыя «Дзядэк», дзе можна даведацца пра гастранамічныя густы маршалка. А з вёскі Вялёндкі ў гміне Карытніца паходзіць род славутага аўтара «Кухара дасканалага», апетага ў «Пане Тадэвушы», — Войцэха Вялёндкі. Будзем спадзявацца, што некалі такія шляхі з'явяцца і ў нас. Той жа Вялікі гасцінец Літоўскі варта працягнуць праз Гродна да Вільнюса.

Што елі ў каралеўскім горадзе над Нёманам у часы ВКЛ, з дакументаў вядома пакуль кепска. А вось далікатэсы міжваеннага часу пакінулі больш слядоў у памяці, і аўтары выдадзенай нядаўна «Чырвонай кнігі Гродна» рупліва іх сабралі. Напрыклад, у сучасным Доме шлюбаў на рагу Віленскай, Ажэшкі і Савецкай да вайны месцілася лепшая на ўвесь горад «Кавярня турка». Уладальнік быў насамрэч ці то азербайджанцам, ці то сербам, але ўмела культываваў вобраз турэцкай кававай культуры — адной з найлепшых у свеце. Тут можна было не толькі выпіць смачнай кавы па-турэцку, але і з'есці ватрушку (ці лепей сказаць — кныш?), што прадаваліся ў пякарні насупраць. А зусім побач месцілася сербская «Бузярня», дзе можна было набыць бузу з халвой. Буза — гэта малочны напой, які нагадваў квас, толькі густы. Сюды заходзілі «абмыць» школьны атэстат, новы шынель, або каб абмеркаваць новы фільм, толькі што прагледжаны ў кіно. А ў пякарні Каплана на Дрывяным базары прадаваліся лепшыя ў горадзе «кайзеркі» — круглыя пшанічныя булачкі. У пекара Любега на сучаснай вуліцы 17 верасня — смачныя здобныя булкі з макам у выглядзе «напалеонкі», трохкутнага капелюша Банапарта. Гімназісты пасля наведвання кінатэатра «Пан» (цяпер «Чырвоная зорка») ласаваліся пончыкамі ў цукерні Кечкоўскага, якая стаяла насупраць. Ну чаму б не аднавіць для «Вялікага гасцінца Літоўскага» хаця б адну з гэтых даўніх пякарняў, цукерняў або кавярняў? Эх, мары! І слінкі... Дачакаемся?

А таксама прakласці, напрыклад, Палескі кулінарны шлях, з Берасця ў Пінск, не мінаючы Моталя, каб можна было ў ім пакаштаваць сушаных уюноў і палескую хатнюю вішнёўку.... Як жа да крыўднага мала рэстаратараў у нас задумваецца пра такія рэчы. Можа, гэтая гісторыя трапіцца на вока нейкаму гарадзенскаму сербу або азербайджанцу, і тады справы пойдуць?

**Алесь БЕЛЫ.**

■ Радавод

# НАПІШЫ ГІСТОРЫЮ. СЯМ'І ЦІ КРАІНЫ



**Архіўныя дакументы Брэсцкай і Гродзенскай абласцей цяпер сталі больш даступнымі. Іх матэрыялы ўвайшлі ў даведнік «Польшча—Беларусь. Супольная гістарычная спадчына. Кіраўніцтва па архіўных матэрыялах 1918—1939 гадоў».**

Кніга выйшла ў мінулым годзе і была прэзентавана ў Варшаве. Аднак аказалася, што яна цікавая і беларускаму чытачу. Таму яе стваральнікі адразу прызналі сваю памылку: яна выпушчана толькі на польскай мове, а варта было б яшчэ і на беларускай. Над выданнем працавалі польскія і беларускія гісторыкі і архівісты Эва Расоўская, Аляксандр Вабішчэвіч, Аляксандр Смалянчук і Анатоль Вялікі. Гэтыя ж людзі былі на прэзентацыі кнігі, што зусім нядаўна адбылася і ў Беларусі — у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук.

Доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі, культуры і рэлігіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Алесь ВАБІШЧЭВІЧ адзначыў, што стварэнне такога даведніка — унікальная праца, аналагаў якой раней не было. Усяго апрацавалі 336 фондаў — а гэта 402 000 адзінак дакументаў. Яны прадстаўляюць Палескае ваяводства, Баранавіцкі павет Навагрудскага ваяводства і іншыя тэрыторыі, цяпер сумежныя з нашымі заходнімі абласцямі.

Тэматыка прагледжаных і сістэматызаваных дакументаў, па словах Вабішчэвіча, надзвычай разнастайная. Ёсць шмат такіх, якія звязаны з дзейнасцю органаў паліцыі, войска. Ёсць дакументы пра міграцыю мясцовых жыхароў па ўсім свеце. Маюцца звесткі пра рэпатрыяцыю і вяртанне пасля вайны, паперы з судоў і пракуратуры. Прычым многія з гэтых звестак былі рассакрэчаны. Фінансавыя, падатковыя органы, сацыяльнае забеспячэнне, сельская, лясная гаспадарка — пры жаданні, падстаў для даследаванняў надзвычай многа. Захоўваюцца дакументы грамадскіх арганізацый, устаноў адукацыі, аховы здароўя, тыя, што прысвечаны структурам канфесій і многія іншыя. У гэтых архівах можна ўбачыць пашпарт Караля Радзівіла, прашэнне на размяшчэнне звярынца «Карона» і цырка-шапіто «Арэна» і нават банкаўскія даўгі.

Відавочна, што ўсе гэтыя дакументы з тых часоў, калі частка нашай краіны ўваходзіла ў склад Польшчы. Нашы гісторыі на працягу стагоддзяў былі цесна знітаваныя, заўважыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Польшчы ў Беларусі Лешэк ШАРЭПКА,** які прысутнічаў на прэзентацыі даведніка ў Мінску. Аднак ён адзначыў, што беларусы не так шмат увагі звяртаюць на гісторыю краіны-суседкі:

— Для мяне дзіўна, што я дагэтуль не бачыў ніводнай гісторыі Польшчы, напісанай беларусам, — яе няма. Вельмі важна, каб вы глядзелі на гісторыю суседняй краіны сваімі вачыма. Бо гэта павінна быць ваша гісторыя, вам трэба яе перажыць і зразумець знутры. Варта проста зрабіць свабодную рэфлексію — я раю гэта вам, бо сам па адукацыі гісторык, і мне цікавыя такія рэчы. Я магу сказаць, што мы і далей будзем спрыяць супрацоўніцтву паміж польскімі і беларускімі гісторыкамі.

Аднак гісторыя краіны, як вядома, пачынаецца не з таго, што адбываецца на палітычнай арэне, але з гісторыі канкрэтнай сям'і. **Эва РАСОЎСКАЯ** расказала пра адметную ініцыятыву «Стань сямейным архівістам», якая сёлета ладзіцца ў Польшчы:



— Гэты год праходзіць пад знакам сямейных архіваў. Усё часцей і часцей у гістарычныя архівы прыходзяць людзі, якія прыносяць свае сямейныя дакументы. Мы хочам заахвоціць усіх, у каго ёсць дома якія-небудзь каштоўныя сведчанні, прыносіць іх. Бо фондам польскіх архіваў быў нанесены моцны ўрон падчас Вялікай Айчыннай вайны, і многія факты з гісторыі нашай краіны, найперш XX стагоддзя, у іх не адлюстраваны. Таму цяпер, каб атрымаць больш поўную базу крыніц для даследавання гэтай гісторыі, нам трэба зацікавіць звычайных людзей, у якіх дома знаходзяцца якія-небудзь сямейныя фотаздымкі, акты грамадзянскага стану, паперы па маёмасці і іншае. Калі яны не захочуць гэта здаць у архівы, бо для іх яно дарагое як памяць і сямейная рэліквія, мы можам проста адсканаваць усё, а арыгіналы вярнуць уладальнікам. Мы разлічваем, што пасля гэтай акцыі дзяржаўныя архівы папоўняцца вельмі каштоўнымі матэрыяламі.

Польскія госці ўжо нават паспелі выдаць адпаведную кнігу пад назвай «Сямейныя архівы. Стань сваім сямейным архівістам», якую прэзентавалі Цэнтральнай навуковай бібліятэцы.

Вяртаючыся да архіўнага даведніка, варта адзначыць, што ён не для шырокага кола чытачоў. Аднак тым аматарам ці навукоўцам, якія жадаюць зрабіць грунтоўнае даследаванне па пэўнай тэме, ён стане вельмі добрым памочнікам, дапаможа зарыентавацца ў вялікай колькасці архіўных звестак.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
**фота аўтара**

## ООО «Арбитр», управляющий по делу о банкротстве – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже имущества частного предприятия «ЛюксМЕБЕЛЬ»:

| № лота | Наименование лота | Начальная цена продажи лота | Шаг торгов (5%) | Задаток (5%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой автомобильный мебельный фургон марки IVECO 40; 2003 год выпуска | 138 117 000 р. | 6 905 850 р. | 6 905 850 р. |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 11 апреля 2014 года в 15.30 по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127/5-411.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: частное предприятие «ЛюксМебель», р/с 3012579158013 в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, код 153001739, УНП 590711617.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 15.30 10.04.2014 по адресу: 230001, г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 530715.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127/5-411, тел. 8(029)3923903, тел./факс 8(0152)530715. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

УНП 100128525

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ОАО «Пивзавод Оливария» за 2013 год

*220002, г. Минск, ул. Киселева, 30*

1. Количество акционеров – всего 235, в том числе юридических лиц – 2, физических лиц – 233.
2. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | млн. рублей | 1494 | 1049 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 122 371 | 122 371 |

3. Информация о задолженности:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | - | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | - | - |

4. Среднесписочная численность работающих (человек) 566.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 г. (в млн руб.)

| АКТИВ | Код стр. | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. Долгосрочные активы** | **190** | **212 717** | **227 408** |
| **II. Краткосрочные активы** | **290** | **145 981** | **247 716** |
| **БАЛАНС** | **300** | **358 698** | **475 124** |
| **ПАССИВ** | **Код стр.** | **На начало периода** | **На конец периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. Собственный капитал** | **490** | **243 822** | **335 427** |
| **IV. Долгосрочные обязательства** | **590** | **56 639** | **51 571** |
| **V. Краткосрочные обязательства** | **690** | **58 237** | **88 126** |
| **БАЛАНС** | **700** | **358 698** | **475 124** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2014 г. (в млн руб.)

| Наименование показателя | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 581 435 | 452 134 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 287 497 | 246 143 |
| Расходы на реализацию | 050 | 177 938 | 127 067 |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **060** | **89 806** | **54 904** |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности** | **090** | **78 252** | **48 310** |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | **150** | **2900** | **- 4137** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **160** | **81 152** | **44 173** |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 200 | 16 789 | 9433 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | **210** | **64 351** | **34 679** |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 27 866 | 38 003 |

**Руководитель** **Шерстенников Д.В.**

**Главный бухгалтер** **Дубовик Л.В.**

## Годовой отчет эмитета ценных бумаг за 2013 г. ОАО «КАМАЙСКИЙ-АГРО»

211862, аг. Камаи, Поставский р-н, РБ, ул. Гагарина, 17.
Т./ф. 5-43-30/5-44-70. УНН 300077290.
Основные виды деятельности: производство сельскохозяйственной продукции
Дипозитарий: ОАО «Белагропромбанк», г. Поставы, ул. Юбилейная, 1 «А»

| Наименование показателя | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| **АКТИВ** | | |
| 1. Долгосрочные активы | 203934 | 233400 |
| 2. Краткосрочные активы | 76049 | 75259 |
| БАЛАНС | 279983 | 308659 |
| **ПАССИВ** | | |
| 3. Собственный капитал | 183343 | 192195 |
| 4. Долгосрочные обязательства | 47452 | 42184 |
| 5. Краткосрочные обязательства | 49188 | 74280 |
| БАЛАНС | 279983 | 308659 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| | | |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 83444 | 71099 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 71206 | 80972 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 7150 | -13052 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 10825 | -8212 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | -3021 | -2694 |
| Чистая прибыль (убыток) | 7804 | -10906 |

**И.о. директора** **Карташевич В.В.**

**Гл. бухгалтер** **Шилько Е.В.**

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

(ОАО «ДСТ-1, г. Витебск», 210026, г. Витебск, ул. Суворова, 16)
**в связи с реорганизацией проводит выкуп собственных акций по требованию акционеров, проголосовавших против, а также не участвовавших во внеочередном общем собрании акционеров 15 января 2014 г. с целью их аннулирования.**

Цена выкупа акций ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» составляет: 6 500 (шесть тысяч пятьсот) бел. рублей за одну простую (обыкновенную) акцию.

Количество акций, которое намеревается приобрести ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» составляет: 3 044 508 (три миллиона сорок четыре тысячи пятьсот восемь) акций.

Письменное требование (заявление) от акционера о выкупе акций направляется по почте либо нарочно в ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» по адресу: 210026, г. Витебск, ул. Суворова, 16 (в рабочие дни — с 9.00 до 17.00, тел. (0212) 36 98 50).

Срок предъявления акционерами требований (заявлений) о выкупе акций с 16 января 2014 г. по 06 марта 2014 г. (включительно).

Для заключения договора купли-продажи акционеру необходимо в срок с 07 марта 2014 г. по 05 апреля 2014 г. обратиться в депозитарий ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» — филиал № 200 — Витебское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10-б, кабинет 312, тел. (0212) 20 48 50. При себе иметь паспорт.

Срок оплаты за приобретенные акции — не позднее 10 (десяти) рабочих дней после совершения сделки, наличными денежными средствами через кассу ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» или безналичным расчетом на вкладные (карт) счета.

*Ранее опубликованный текст объявления о выкупе акций в газете «Звязда» № 13 от 24.01.2014 г. считать недействительным.*

**Контактный телефон: (0212) 36 98 50.** УНП 300000398

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное предприятие**

## «УКС Фрунзенского района г. Минска»

**(информация о застройщике и проекте строительства)**

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 27 февраля 2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. 4-й Загородный, 64а.

Тел./факс 204-67-99, 252-32-18.

Режим работы – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 4. 1-ая очередь строительства. Жилой дом № 2.» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Жилой дом № 2 запроектирован в монолитном каркасе с наружными стенами из блоков ячеистого бетона с утеплением минераловатными плитами, односекционный, 19-этажный. Проектом предусмотрено техническое подполье и технический чердак. Очертания здания в плане близки к квадрату. Высота жилого этажа – 3,0 м, 1-го этажа (встроенные помещения общественного назначения) – 3,6 м. В составе встроенных помещений: магазин «Мясопродукты», парикмахерская и группа помещений для работы администрации жилищно-строительного кооператива.

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 года № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь» для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:

- магазин «Мясопродукты» общей площадью 256,69 кв.м;
- парикмахерская общей площадью 90,69 кв.м.

Цена 1 кв. метра общей площади на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов по состоянию на ноябрь 2014 года и составляет:

- при строительстве магазина «Мясопродукты» – **18 193 000 белорусских рублей.**
- при строительстве парикмахерской – **18 515 000 белорусских рублей.**

Начало строительства – октябрь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – ноябрь 2014 года.

С планировками встроенных помещений и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. 4-й Загородный, 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

*Уважаемые акционеры ОАО «Белбакалея»*

*27 марта 2014 года*

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Белбакалея»

**по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.**

*Повестка дня собрания:*

1. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2013 году.
2. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год и основных направлениях развития Общества на 2014 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2013 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2014 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания:

- в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 20 по 27 марта 2014 года, по месту нахождения Общества – г. Минск, ул. Промышленная, 15, кабинет 44 с 9.00 до 17.00, 27 марта 2014 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 27 марта 2014 года, 14.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность. УНП 100025653.

## Объявление о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов

| 1. Дата, время, место проведения аукциона: 08 апреля 2014 года, в 10.00, в здании Великодолецкого сельского Дома культуры, ул. Лесная, 2 А. | | |
|---|---|---|
| 2. Адрес участка | Участок № 1: дер. Ветче, д. 20 Великодолецкого сельсовета, Ушачского района | Участок № 2: д. Ветче, д. 22 Великодолецкого сельсовета Ушачского района |
| 3. Площадь участка | 0,2499 га | 0,250 га |
| 4. Кадастровый номер | 224980705601000027 | 224980705601000028 |
| 5. Начальная цена | 15 000 000 руб. | 15 000 000 руб. |
| 6. Шаг аукциона | 2 000 000 руб. | 2 000 000 руб. |
| 7. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1Б, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 07.03.2014 по 06.04.2014 включительно. | | |
| 8. Размер задатка — 2 000 000 рублей, вносится на расчетный счет: Великодолецкий сельский исполнительный комитет 3641328011094 в ф-ле № 216 ОАО «СБ Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНП 300007086, ОКПО 28677750 | | |
| 9. Адрес и номер контактного телефона: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1Б, Великодолецкий сельисполком 8 02158 23323, 23338, 8970700 МТС, рабочие дни с 8.00 до 16.00. | | |

**Извещение об изменении повестки дня общего собрания акционеров.**
***Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!***

В повестку дня общего собрания акционеров ОАО «Универмаг «Солигорск», которое состоится «25» марта 2014 года по адресу: 223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4 этаж, актовый зал, в 14.00, **ВНОСЯТСЯ ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ:**

11. Периодичность выплаты дивидендов за 2014 год.
12. О внесении изменений и дополнений в Положение о коммерческой тайне ОАО «Универмаг «Солигорск». УНП 600024725

В **суд Кобринского района** поступило заявление об объявлении гражданина ДАДОНОВА Владимира Капитоновича умершим, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине Дадонове Владимире Капитоновиче, 1954 года рождения, уроженца хутора Алдабульский Дубовского района Ростовской области, последнее известное место жительства: Республика Беларусь, Брестская область, Кобринский район, д. Повитье, ул. Зеленая, д. 14, местонахождение которого неизвестно, в отношении которого ставится вопрос об объявлении его умершим, с предложением в течение двух месяцев с момента публикации сообщить о данном гражданине имеющиеся сведения в суд Кобринского района Брестской области Республики Беларусь.

**«ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ИП «МИРАЛЕКС», ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 15.04.2014 ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ДОЛЖНИКА, ВПЕРВЫЕ ВЫСТАВЛЯЕМОГО на торги в 15.00, А ТАКЖЕ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 43, пом. 20.**

Впервые выставляются на торги:

- **насос АСЦЛ-20-24Г** (3 шт.) по цене 44 387 000 руб.;
- **стояк загрузочный** по цене 37 379 000 руб.;
- **стояк сливной** по цене 37 379 000 руб.

На повторные торги выставляются (первичные торги состоялись 28.02.2014 г.):

- **автозаправочная станция** по цене 40 500 000 руб.;
- **объекты недвижимости и имущество нефтебазы –** 244 620 000 руб.

Заявки на участие в вышеуказанных торгах принимаются до 11.04.2014 г.

С информацией о порядке, условиях проведения первичных торгов и повторных торгов, предметах торгов можно ознакомиться на сайте **www.sov.by,** а также по тел.: **+37529 177 55 11.**

УНП 190816859

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 26 марта 2014 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование продаваемого имущества)** | **Самолёт «CESSNA CITATION X», девятиместный, с двумя турбореактивными двигателями, серийный номер 750-0300, регистрационный номер OE-HAK, 2009 год выпуска, цвет белый с красным.** |
| **Начальная цена** | 38 034 360 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 3 800 000 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |

Местонахождение продаваемого имущества – территория аэропорта «Минск-1».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **26 марта 2014 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.03.2014 по 24.03.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22; (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-38149 (назначение – Здание административно-хозяйственное), (принадлежности: тепловая, канализационная (фекальная) сеть), г. Гродно, ул. Победы, 20, 2-этажное, кирпичное, 1987 г. п., S общ. – 251,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55780 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – Материальный склад), г. Гродно, ул. Победы, 20/2, 1964 г. п., кирпичный, S общ. – 2701,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53918 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад № 3), (принадлежность: топочная; эстакада), г. Гродно, ул. Победы, 20/3, 1993 г. п., кирпичный, S общ. – 171,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55782 (назначение – здание нежилое, наименование – пилорама), г. Гродно, ул. Победы, 20/4, кирпичная, 1970 г. п., S общ. – 150,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-2900 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж для тракторов), г. Гродно, ул. Победы, 20/5, кирпичное, 1993 г. п., S общ. – 199,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55738 (назначение – здание нежилое, наименование – водонасосная), г. Гродно, ул.Победы, 20/6, кирпичная, 1982 г. п., S общ. – 45,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-49804 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 7 машин), г. Гродно, ул. Победы, 20/7, кирпичное, 1987 г. п., S общ. – 285,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-49807 (назначение – здание многофункциональное – весовая с гаражом), (составные части: гараж), г. Гродно, ул.Победы, 20/8, кирпичное, 1963 г. п., S общ. – 93,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-3112 (назначение – здание нежилое, наименование – сушильная камера-мастерская), г. Гродно, ул. Победы, 20/9, кирпичная, 1993 г. п., S общ. – 64,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-19819 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад для металла), г. Гродно, ул.Победы, 20/10, кирпичный, 1963 г. п., S общ. – 682,8 кв.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-2864 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 6 автомашин), г. Гродно, ул. Победы, 20/11, кирпичный, 1987 г. п., S общ. – 150,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-3376 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на три места), г. Гродно, ул. Победы, 20/12, кирпичный, 1993 г. п., S общ. – 182,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55741 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад горючих и масел с гаражом и заправочной), г. Гродно, ул. Победы, 20/13, кирпичный, 1963 г. п., S общ. – 67,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55743 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад химпродуктов), г. Гродно, ул. Победы, 20/14, кирпичный, 1990 г. п., S общ. – 47,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-50180 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж для легкового транспорта), г. Гродно, ул. Победы, 20/15, кирпичный, 1994 г. п., S общ. – 69,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55737 (назначение – здание нежилое, наименование – насосная станция для перекачки кислот и горючих материалов), г. Гродно, ул. Победы, 20/16, кирпичная, 1963 г. п., S общ. – 8,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55739 (назначение – здание нежилое, наименование – уборная на 2 очка), г. Гродно, ул. Победы, 20/17, кирпичная, 1963 г. п., S общ. – 6,4 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55740 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар на 300 $м^3$), г. Гродно, ул. Победы, 20, бетон, 1964 г. п., S общ. – 75 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53259 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – проезд), (принадлежность две ц/б площадки), г. Гродно, ул. Победы, 20, S общ. – 5957,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53253 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), г. Гродно, ул. Победы, 20, чугун, сталь, 1979 г. п., протяж. 0,146 км.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории), (принадлежности: ворота автомобильные металлические, ворота автомобильные механические металлические).<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55781 (назначение – здание нежилое, наименование – проходная), (принадлежность – канализация фекальная), 1963 г. п., кирпичная, S общ. – 58,9 кв.м.<br>- Кабельная линия электропередач 0,4 кВт, г. Гродно, ул. Победы, 20.<br>- Воздушная линия электропередач 0,4 кВт, г. Гродно, ул. Победы, 20. |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Победы, 20 |
| **Лот расположен на земельном участке** | Кадастровый номер 440100000001001667 площадью 1,6481 га (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания производственной базы) |
| **Начальная цена продажи** | 5 126 641 192 (пять миллиардов сто двадцать шесть миллионов шестьсот сорок одна тысяча сто девяносто два) белорусских рубля без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 256 332 060 (двести пятьдесят шесть миллионов триста тридцать две тысячи шестьдесят) белорусских рублей |
| **Продавец** | Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 21 марта 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» № 178 (27543) от 21.09.2013 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 14 марта 2014 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОННОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА

| Лот № 1 | Кафе с инв. № 632/С-25929 | Адрес: Минская обл., Воложинский р-н, Воложинский с/с, М6, 85-й км, 1 | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 360 000 000 | 36 000 000 | 5 |

Назначение – здание специализированное для общественного питания. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 72 $м^2$/61,4 $м^2$. Год постройки – 2005. Фундамент – бетонный. Стены – бревенчатые. Перегородки – дощатые. Перекрытия чердачные – деревянные. Крыша – шиферная. Полы – дощатые. Проемы оконные – деревянные. Проемы дверные – филенчатые. Внутренняя отделка – окрашено. Отопление – местное, печное. Электроснабжение – открытая проводка. Горячее водоснабжение – от бойлера. Водопровод, канализация, вентиляция, телефон имеются.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,3319 га с кадастровым номером 622000000001000011. Целевое назначение – размещение коммерческих объектов. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

В связи со строительством объекта «Автомобильная дорога М-6 Минск-Гродно, КМ 42, 09-КМ 91,07», часть земельного участка площадью 0,1080 га с расположенными на нем асфальтным покрытием и многолетними насаждениями будет изъята.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе Объекта осуществляется в течение 3 (трех) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта.

При отказе Победителя аукциона (Претендента на покупку) от заключения договора купли-продажи, оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта, сумма внесенного им задатка остается у Продавца.

Продавец обязуется в течение 14 (четырнадцати) календарных дней вывезти с Объекта торговое оборудование, принадлежащее Продавцу, если иное не будет предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в размере, не превышающем 12 000 000 руб. на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 11.04.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ.лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества Воложинского РАЙПО, проводимом 11 апреля 2014 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни **с 8.30 до 17.00** по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2.** Окончание приема заявлений **08.04.2014 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников **11.04.2014 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Владислав Валерьевич 8 (029) 639-02-90.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 193319@mail.ru**

■ Ёсць нагода

# КАБ ДЗЯЦІНСТВА БЫЛО ШЧАСЛІВЫМ

**Дзяцінства мусіць быць шчаслівым. У гэтым упэўнены стваральнікі беларускай версіі рубрыкі «У вас будзе дзіця», якая 11 сакавіка адзначае дзень нараджэння — два гады ў эфіры тэлеканала сумесна з папулярнай расійскай перадачай «Пакуль усе дома». Пранізлівыя і шчырыя сюжэты пра лёсы маленькіх людзей, якім вельмі патрэбна мець СВАЮ сям'ю, дзе іх любяць і чакаюць, ужо прынеслі адчувальны плён: з амаль 100 герояў перадачы, з якімі знаёміла гледачоў тэлеканала АНТ вядучая рубрыкі Людміла Бусько, 42 ужо ўладкаваныя ў сем'і.**

**Як здымаюцца кранальныя і няпростыя сюжэты, што застаецца па-за кадрам і ці лёгка дастукацца да сэрцаў дарослых, мы гутарым з творчай камандай, якая працуе над праектам.**

## КОЖНАМУ ПАТРЭБНА СЯМ'Я

— Звычайна мы паказваем дзяцей, якія могуць быць усыноўленыя, — расказвае **прадзюсар праекта Алег ЛЕПЕШАНКОЎ.** — Але існуюць даследаванні аб тым, што кожнаму дзіцяці да 3 гадоў надзвычай важна мець кантакт з дарослымі — тактыльны, эмацыянальны, душэўны — для фарміравання чалавека, каб ён у будучыні сам змог будаваць блізкія стасункі з іншымі. На жаль, у сістэме, якая існуе, даць усё гэта кожнаму выхаванцу дзіцячага дома проста фізічна немагчыма, пра гэта гавораць і самі выхавальнікі, кіраўнікі, урачы ў Дамах дзіцяці. Мы сутыкаемся з тым, што ў дзіцячых дамах здаровыя, адносна «беспраблемныя» малыя нядоўга чакаюць, каб іх усынавілі ці ўдачарылі — на зусім маленькіх ёсць нават «ліст чакання» з патэнцыйных усынавіцеляў. А разам з тым даволі шмат дзяцей у Беларусі — тыя, хто мае патрэбу ў сям'і, але ўсыноўлены быць не могуць... Таму нядаўна мы знялі ў Дамах дзіцяці дзве не зусім звычайныя праграмы — пра тых дзяцей, якіх з розных прычын усынавіць нельга, але выйсцем для іх маглі б стаць прыёмныя сем'і. Вядучай давялося грунтоўна падрыхтавацца, вывучаць заканадаўчую базу, кансультавацца са спецыялістамі Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення, мясцовага аддзела адукацыі, каб расказаць пра гэту праблему карэктна і граматна, растлумачыць, чым канкрэтна можа дапамагчы дзецям прыёмная сям'я... Можна стаць гэтаму дзіцяці сябрам, браць яго да сябе на выхадныя ці святы, каб магчыма было паказаць яму мадэль, вобраз сям'і. Часта ж у выпускнікоў дзіцячых дамоў узнікаюць праблемы ў дарослым жыцці менавіта з-за таго, што перад вачыма не было прыкладу сям'і, паводле якога можна было б будаваць уласную.



**— Напэўна, за два гады паглыблення ў адну тэму вельмі цяжка не паўтарацца, прыдумляць новыя хады...**

— Зусім не цяжка, — пярэчыць **рэжысёр праекта Дзмітрый БІЁНЧЫК,** якому даводзіцца не толькі здымаць і манціраваць сюжэты, але і часам ствараць адпаведную атмасферу падчас здымак, каб дзеці раскрыліся, пайшлі на кантакт з «прышлымі» дарослымі. — Бо кожны сюжэт распавядае пра канкрэтнае дзіця, і атрымліваецца ў выніку гэткім жа індывідуальным, нават калі форма ці змест яго падобныя: сёння ў кадры малы з адным тэмпераментам, заўтра з процілеглым, сёння ён «свеціцца» больш, заўтра менш. І выхавальнікі, і адміністрацыя кожнага дзіцячага дома нам вельмі дапамагаюць, прапануюць нейкія адметныя хады, каб паказаць дзіця ў найбольш выйгрышным святле..

## З КАДРА — У СЭРЦА

У Беларусі 25 дзейных дзіцячых дамоў. Здымачная група праекта «У вас будзе дзіця» пабывала ва ўсіх, шмат дзе неаднойчы.

— Безумоўна, былі здымкі, якія адбіліся ў памяці, — узгадвае рэжысёр. — Кожны раз прапускаеш падзеі праз сябе, перажываеш: гэта ўсё ж дзеці, а я сам бацька, таму усе іх пачуцці для мяне вельмі блізкія... Вельмі прыемна кантактаваць з зусім маленькімі, я ўжо адвык ад такіх «гномікаў». А з іншага боку, нездарма кажуць, што найбольш складана здымаць дзяцей і жывёл. І сярод мноства мілых, цікавых дзетак сустракаюцца такія, што проста бяры і давай «Оскара» гэтаму малому! Скажаш яму — ідзі на камеру больш павольна — ідзе, хоць яму 2,5 года; што, здавалася б, разумее; прапануеш — усміхніся, так усміхнецца, быццам у душу табе зазірне... Безумоўна, такіх запамінаеш найлепш. Хоць бываюць, наадварот, вельмі складаныя сітуацыі, калі з нас літаральна выпіваюць кроў. Я дагэтуль са спачуваннем узгадваю адзін сталічны дзіцячы дом. Праз 10 хвілін знаходжання ў ім мы зразумелі, што выхавальнікам трэба ставіць помнік, настолькі няпроста было знаходзіцца з тымі дзецьмі — яны нас не чулі, не ўспрымалі...

— Я пагаджуся, што запамінаюцца кожныя здымкі, — ківае **каардынатар праекта Ілона ХАЛЬВІТА.** — Бо псіхалагічна прывыкнуць да гэтага немагчыма: ты прыходзіш, а малыя бягуць да цябе і абдымаюць за ногі з пытаннямі: «Ты мая мама?» ці «Калі ты мяне адсюль забярэш?». Здаецца, у Барысаве быў хлопчык — круглы сірата: бацькі загінулі, нікога з родных няма. Няня падышла да нас са слязамі: «Вы тут пра іншых дзяцей здымалі, калі ласка, здыміце яго таксама — ён жа адзін ва ўсім свеце». З маленькімі дзецьмі складана працаваць чыста тэхнічна — нашы аператарыператвараюцца ў гэткіх паўзуноў з тэлекамерамі, каб малыя да іх прывыклі і падпусцілі да сябе. Уся наша здымачная група дзяцей любіць, мы стараемся ўсе разам знайсці нейкі падыход, прывозім загадзя прыгатаваныя падарункі ад тэлеканала і спонсараў — і ў выніку дзеці, якія дагэтуль ні з кім не размаўлялі, уваходзяць у кадр і гутараць з вядучай... А яшчэ я заўжды адзначаю стаўленне персаналу да дзяцей — гэта павінны быць такія асаблівыя людзі, якія могуць быць «бацькамі» для ўсіх.

Здымачная група ўзгадвае, як у Вялікіх Лётцах, што пад Віцебскам, іх уразіла створаная пры дзіцячым доме царква і тамтэйшы святар айцец Валерый. Тая паездка была не падобная да ўсіх астатніх — настолькі пранікліся ўсе асаблівай атмасферай душэўнасці і надзеі. «Дырэктар Вера Пятроўна Дук заўжды кажа выхаванцам: «Калі вам будзе дрэнна — вяртайцеся да нас, пагаворым». І яны ведаюць: заўсёды, што б ні здарылася, ёсць куды вярнуцца».

— Нас напачатку сапраўды здзіўляла, як па-чалавечы добра ставяцца да дзяцей кіраўнікі і персанал дзіцячых дамоў, — дадае Алег Лепешанкоў. — У віцебскім Доме дзіцяці, напрыклад, адразу некалькі супрацоўнікаў усынавілі дзетак. А да дырэктара сталічнага дзіцячага дома №6 Тамары Эдуардаўны Саўчанкі выхаванцы часта заходзяць, проста каб пагаварыць па душах, параіцца аб чымсьці важным — і відаць, што яна для гэтых дзяцей блізкі, амаль родны чалавек. Нізкі паклон такім людзям, якія не проста ходзяць на працу, каб адбыць яе, а паказваюць узор служэння сваёй справе.



З самага пачатку, як расказваў вядучы праграмы «Пакуль усе дома» Цімур Кізякоў, на Першым канале ставіліся да рубрыкі даволі насцярожана, прыглядаліся, ці не будзе яна выпадаць з агульнага пазітыўнага настрою ранішняга эфіру. «Але ў нас адразу быў выпрацаваны падыход — па-першае, расказваць пра дзяцей цікава, паказваць кавалачкі іх сапраўднага жыцця, падкрэсліваць усе іх здольнасці і таленты, па-другое, задаваць адпаведны настрой — каб гледачы не шкадавалі гэта дзіця, не плакалі над ім, а ўсведамлялі, што яго лёс з іх дапамогай можа змяніцца да лепшага, што яны, паспяховыя і шчаслівыя, могуць падзяліцца з маленькім чалавекам сваім шчасцем».

## РАБІЦЬ І НЕ ВАГАЦЦА

З 42 герояў рубрыкі, якія знайшлі свой дом і клапатлівых бацькоў, 27 усынавілі, 9 узялі пад апеку, 4 выхоўваюцца ў дзіцячым доме сямейнага тыпу, 1 — у прыёмнай сям'і, яшчэ адно дзіця вярнулі ў біялагічную сям'ю.

— Амаль 50% уладкаваных у сем'і дзяцей — я лічу, гэта вельмі добры вынік, — разважае Алег. — Пры тым, што першыя паўгода была цішыня: напэўна, людзі прыглядаліся да праграмы. Мы тэлефанавалі кожны тыдзень у Нацыянальны цэнтр усынаўлення, пыталіся, як рэакцыя, колькі званкоў — здавалася, што водгуку няма. А потым людзей нібыта прарвала, і за невялікі час усынавілі адразу 6 дзетак. Справа ў тым, што патэнцыйныя ўсынавіцелі мусяць яшчэ прайсці пэўны шлях. Не сказаць, каб ён быў такім ужо складаным у юрыдычным сэнсе, як многія думаюць, але, напрыклад, абавязкова трэба прайсці курсы па падрыхтоўцы да ўсынаўлення. Усё гэта займае пэўны час, таму працэс пайшоў не адразу. Але пайшоў! Наша задача ў тым, каб, убачыўшы сюжэт, чалавек, які ў чымсьці сумняваецца, вагаецца, зразумеў, што нашы героі — тыя ж самыя нармальныя, цудоўныя, жвавыя дзеці, як тыя, што бегаюць у яго двары. Мы, калі хочаце, абуджаем найлепшыя пачуцці і разам з тым сацыяльную адказнасць у людзей, якія самі ўжо дасягнулі пэўнага жыццёвага ўзроўню, дабрабыту, і цяпер могуць і хочуць падзяліцца часткай сваіх здабыткаў з іншымі. Але, безумоўна, рашэнне ўзяць дзіця ў сям'ю мусіць быць узважаным і вельмі адказным.

У планах стваральнікаў праекта — пашырыць і прыцягваць новую аўдыторыю з дапамогай іншых тэлевізійных і радыёпраграм, інтэрнэт-сайтаў, якія маглі б распавесці пра лёс ужо ўсыноўленых дзяцей, больш падрабязна расказаць пра самі здымкі рубрыкі. «Хацелася б запрашаць да размовы спецыялістаў у галіне ўсынаўлення, бацькоў-усынавіцеляў — безумоўна, толькі з іх згоды, бо не ўсе хочуць і гатовыя расказаць свае гісторыі, але ёсць і тыя, хто ўголас можа падзяліцца радасцю ўсынаўлення», — прыадкрывае бліжэйшую будучыню Ілона Хальвіта. Таксама сумесна з аддзелам інтэрнэт-вяшчання АНТ і Нацыянальным цэнтрам усынаўлення рыхтуецца серыя з 10-15 дапаможных вучэбных міні-фільмаў пад рабочай назвай «Ужо ў сям'і», якія дапамогуць бацькам папярэдзіць або вырашыць праблемы, звязаныя з адаптацыяй дзіцяці ў сям'і: як правільна размаўляць з уласнымі сваякамі і як будаваць стасункі з біялагічнымі роднымі ўсыноўленага дзіцяці, якія неапраўданыя чаканні не варта ўскладваць на дзіця, і г.д. Інтэрнэт-версію рубрыкі кожны тыдзень паказвае партал TUT.BY. А ў найбліжэйшы час да праекта далучыцца і «Звязда».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота прадастаўлена здымачнай групай праекта**

■ Ведай нашых!

# «Беларуская чыгунка» перамагла на міжнародным конкурсе ў Італіі

**Памятная сярэбраная манета Нацыянальнага банка «Беларуская чыгунка. 150 гадоў» (мастак Святлана Заскевіч) заваявала першае месца ў намінацыі «Міжнародная прэмія Вічэнца Паладыа» на 10-м міжнародным конкурсе «Міжнародная прэмія Вічэнца Нумізматыка» і «Міжнародная прэмія Вічэнца Паладыа», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Беларусі.**

Журы, якое ўзначальвае прэзідэнт нумізматычнай супольнасці Італіі спадар Эрман Вінзман Фалгера, адзначыла ў беларускай памятнай манеце «выдатнае адлюстраванне архітэктурных збудаванняў». На манеце, выпушчанай у 2012 годзе, намалявана сімвалічнае падарожжа ў часе з мінулага ў сёння дзякуючы архітэктуры старога будынка чыгуначнага вакзала ў Гродне і будынка сучаснага вакзала ў Мінску, а таксама паказана эвалюцыя развіцця чыгуначных зносін і спадарожных архітэктурных збудаванняў. Два будынкі адлюстраваны дэталёва ў перспектыве, што перадае адчуванне дзвюх эпох.




Чарговая перамога беларускай памятнай манеты ў гэтым прэстыжным конкурсе сведчыць аб прызнанні міжнароднай грамадскасцю плённай працы спецыялістаў нашага Нацыянальнага банка.

На гэтым нумізматычным конкурсе ўзнагароды атрымліваюць самыя прыгожыя манеты, адчаканеныя манетнымі дварамі або дзяржаўнымі адміністрацыямі. Сёлета ў ім удзельнічала 48 манет з 16 краін: Аўстраліі, Арменіі, Ватыкана, Ізраіля, Італіі, Казахстана, Кыргызстана, Латвіі, Літвы, Новай Зеландыі, Польшчы, Партугаліі, Беларусі, Сан-Марына, Сінгапура і Украіны.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1550** год — нарадзіўся Лаўрэнцій Зізаній, беларускі педагог, царкоўны дзеяч, перакладчык. Працаваў выкладчыкам у праваслаўных брацкіх школах Львова, Брэста, Вільні. У 1596 г. у Вільні ў брацкай друкарні выдаў першы ў Беларусі і ва Украіне буквар «Наука ку читаню и розуменю писма словенского», у які ўключыў тлумачальны слоўнік на 1061 слова, а таксама «Грамматику словенскую...». З 1619-га выкладаў у Кіева-Пячэрскай лаўры, перакладаў з грэчаскай мовы, рэдагаваў кнігі. У 1627 годзе ў Маскве выдаў напісаны па заданні патрыярха Філарэта «Катэхізіс», у якім на беларускай мове выклаў звесткі аб прыродзе і даў блізкае да пратэстантызму тлумачэнне царкоўных дагматаў (перавыдаваўся ў Гродне ў 1783, 1787 і 1788 гг.). Памёр у 1634 годзе.

**1669** год — у Італіі пачалося вывяржэнне вулкана Этна, якое працягвалася да ліпеня. Рэкі расплаўленай лавы пахавалі 50 гарадкоў, па розных звестках, загінулі ад 20 да 100 тысяч чалавек. Вулкан Этна размешчаны на востраве Сіцылія. Мясцовыя жыхары завуць яго «Мангібела» — «Гара гор». Этна сапраўды ўражвае сваімі памерамі: плошча гэтага горнага масіва — 120 квадратных кіламетраў, а акружнасць вулкана складае дзвесце кіламетраў. Пры вывяржэнні ў 1964 годзе Этна вырасла яшчэ на пяцьдзясят метраў, і цяпер яе вышыня складае больш за 3300 метраў. Масіў налічвае 270 кратараў, і лава выплюхваецца з расколін глыбінёй у адзін кіламетр. Гэтаму вулкану належыць першынство па колькасці вядомых вывяржэнняў. З часоў хрысціянскага летазлічэння адбылося 150 магутных вывяржэнняў Этны.



**1887** год — нарадзіўся (былы фальварак Новы Двор, цяпер Мінскі раён) Алесь Гарун (Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі), беларускі паэт, празаік, публіцыст. Пачаў публікавацца з 1907-га ў газеце «Наша ніва». Арыштаваны 4 сакавіка 1907 года ў падпольнай друкарні на вуліцы Шырокай у Мінску, дзе ў той момант друкавалася адозва «Да ўсіх працоўных». У ліпені 1908-га Віленскай судовай палатай асуджаны на ссылку і пажыццёвае пасяленне ў Сібіры. Сасланы ў Іркуцкую губерню, пазней атрымаў права перамяшчацца па ўсёй Сібіры. Працуючы на рацэ Лене, падрыхтаваў зборнік «Матчын дар» і ў 1914-м пераслаў яго ў Вільню. Аўтар зборніка п'ес для дзіцячага тэатра «Жывыя казкі». Віцэ-старшыня Усебеларускага з'езда (1917); удзельнічаў у стварэнні БНР. Памёр ад сухотаў у 1920 годзе.

Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, публіцыст:**

***«Прайграць не прыніжэнне. Прыніжэнне — кпіць з таго, хто мужна прайграў».***

## Усходні гараскоп на тыдзень

**АВЕН.** Калі не будзеце ўскладаць занадта вялікіх надзей на партнёраў і правільна разлічыце свае сілы, тое ўсе задуманыя і рызыкоўныя прадпрыемствы завершацца паспяхова. Пры гэтым займайцеся толькі сваёй справай, а іншыя няхай вырашаюць свае пытанні самастойна. Цяпер вы павінны працаваць на найбліжэйшую будучыню, рэалізоўваць новыя ідэі і планы.

**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень лепш за ўсё прысвяціць наладжванню карэктных адносін з новымі калегамі і сябрамі, якія з'явіліся нядаўна. Перш чым прымаць у аўторак канчатковае рашэнне па фінансавых пытаннях, варта пераканацца, што вы не ўпусцілі ніводнай істотнай дэталі. Будзьце ветлівыя і настойлівыя адначасова, не здавайцеся пры першых цяжкасцях, і гэтыя дзеянні абавязкова прывядуць да поспеху. Канец тыдня дасць магчымасць нацешыцца радасцю і шчасцем.

**БЛІЗНЯТЫ.** Сумленныя ўзаемадзеянні будуць вельмі важныя, таму гуляць у кошкі-мышкі з навакольнымі непажадана. Ваш аўтарытэт працягвае стабільна расці, а тыя, хто побач, будуць чакаць ад вас спагады і падтрымкі. Не падманвайце іх чаканні, але і не ўзвальвайце на свае плечы занадта шмат чужых праблем. Пазбягайце рызыкаваць без важкіх на тое прычын — поспех у авантурах будзе практычна роўны нулю.

**РАК.** Не варта перагружаць сябе, паспрабуйце скараціць аб'ём працы і не забывайце лішні раз абдумваць свае словы і дзеянні. Хутчэй за ўсё, давядзецца набрацца цярпення, бо хуткі прагрэс у справах цяпер практычна немагчымы. У сярэдзіне тыдня атрымаеце нечаканыя весткі, а да яго канца вы зможаце прыцягнуць да сябе ўвагу кіраўніцтва і заручыцца падтрымкай вельмі ўплывовых асоб. Суботу будзе нядрэнна прысвяціць рамонту ці добраўпарадкаванню кватэры, дачы ці проста навядзенню парадку ў доме.

**ЛЕЎ.** Тыдзень павінен пацешыць удалым спалучэннем творчага ўздыму і добрага настрою. Тым не менш, у вас могуць наспяваць унутраныя змены, і пакуль яны не сфарміруюцца канчаткова, устрымайцеся ад адкрытых гутарак з сябрамі і блізкімі вам людзьмі, нават калі яны гатовыя выявіць разуменне. У роздумах пра сэнс жыцця можа адкрыцца новае значэнне звыклых рэчаў і ўсведамленне таго, што часам вы не ў сілах паўплываць на ход падзей. Але вы заўсёды зможаце падрыхтаваць сябе да любых нечаканасцяў, а ўчарашнія сапернікі могуць аказацца надзейнымі саюзнікамі.

**ДЗЕВА.** Каб выканаць дзелавыя і фінансавыя абавязацельствы тыдня, давядзецца сканцэнтраваць усе сілы. У прафесійнай сферы настае вельмі плённы перыяд, але рызыкаваць ці згаджацца з сумніўнымі прапановамі не варта. Паспрабуйце не казаць лішняга, і тады шматлікія пачынанні ў першай палове тыдня будуць удалымі. Абавязкова ўмацоўвайце сувязі з людзьмі, якія вас цікавяць, а ў чацвер пазбягайце спрэчак з начальствам і не крытыкуйце калег па працы.

**ШАЛІ.** Як гэта ні дзіўна, але вам удасцца рэалізаваць нават самыя смелыя планы. Ваш творчы патэнцыял, працаздольнасць, жыццёвая энергія значна ўзрастуць, а разам з імі і аптымізм, і інтуіцыя. Падыходзьце з усёй адказнасцю да справы, якую вам могуць даручыць, і атрымаеце шанц змяніць працоўную сітуацыю ў лепшы бок. У чацвер і пятніцу вас можа адцягваць ад працы рамантычны настрой.

**СКАРПІЁН.** Далучаючыся да працы над рэалізацыяй чужых планаў, адэкватна разлічыце свае сілы і магчымасці, хутчэй за ўсё, вы будзеце схільныя іх перабольшваць, а наступствы такой памылкі вельмі нескладана прадбачыць. Таму праяўляйце ўважлівасць, акуратнасць, стрыманасць і дыпламатычнасць. Не выключана, што ў пятніцу вас заваляць працай, таму паспрабуйце не выплюхваць негатыўныя эмоцыі на навакольных. Выхадныя лепш за ўсё правесці ў коле сапраўды блізкіх вам людзей, марнаваць энергію на староннiх у гэтыя дні будзе недазваляльнай раскошай.

**СТРАЛЕЦ.** Можаце нечакана знайсці новыя кропкі прыкладання сіл. Ваша лагічнае мысленне будзе працаваць асабліва добра, што дасць магчымасць знаходзіць нестандартныя рашэнні. Не варта паддавацца часовым цяжкасцям, лепш звярніцеся па дапамогу і параду да блізкіх людзей. Каб не правакаваць глабальнае непаслушэнства ў дзяцей і не ствараць сабе лішніх складанасцяў, пажадана не чапляцца да іх па дробязях. Пятніца можа аказацца днём, калі будзе па сілах перарабіць масу спраў, абавязкова скарыстайцеся гэтым.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень спрыяльны для рэалізацыі вашых задум, да таго ж не выключана своечасовая падтрымка сяброў і блізкіх людзей. З-за напружанага працоўнага рытму, хутчэй за ўсё, давядзецца задумацца над зменамі ўмоў вашай працы. Абавязкова захоўвайце пачуццё гумару і здаровы розум і паспрабуйце не выдаваць нейкую важную інфармацыю: ёй могуць скарыстацца ў карыслівых мэтах.

**ВАДАЛЕЙ.** Ваш аўтарытэт паступова ўзрастае, а навакольныя чакаюць ад вас своечасовых і мудрых парад. На гэтым тыдні ўсё павінна быць больш-менш добра, але гэта залежыць ад таго, як вы будзеце рэагаваць на сітуацыі, якія ўзнікаюць. Не варта ўзвальваць на сябе чужыя праблемы, улічыце, што вас можа чакаць вострая барацьба з канкурэнтамі, якая пакажа, што вы маеце поўнае права на самастойныя рашэнні. Не спрабуйце рызыкаваць без важкіх прычын, шанц на поспех цалкам адсутнічае.

**РЫБЫ.** Будзе складана ўсвядоміць што і навошта вы робіце, таму што любое, нават старанна спланаванае пачынанне здольнае ператварыцца ў поўную бяссэнсіцу. Займацца лепш за ўсё дробязямі ці справамі, у якіх немагчыма памыліцца. Вельмі спрыяльныя кантакты з калегамі здалёк, магчымы таксама іх прыезд ці ваша камандзіроўка да іх. У стасунках з сябрамі не выключаны складанасці, бо некаторыя з іх могуць павесці сябе зусім непрадказальна. Моцная занятасць на працы можа таксама выклікаць ускладненні ў асабістым жыцці.

■ Небяспека

# Ахвяра экстрэмальнай рыбалкі

**Няўжо людзі не разумеюць, што цяпер выходзіць на лёд небяспечна? Асабліва ў заходніх раёнах краіны, дзе лёд амаль што растаў... І ўсё роўна ідуць.**

Вось і на гэтым тыдні недарэчна абарвалася жыццё мінчаніна, які прыехаў з сям'ёй адпачываць у санаторый «Ружанскі», што ў Пружанскім раёне. 39-гадовы мужчына ўзяў рыбацкія снасці і пайшоў на возера Паперня. Лёд там цяпер нетрывалы, таму чалавек праваліўся. Яго спрабавалі выратаваць выпадковыя сведкі, але гэтага зрабіць не ўдалося. Рыбак быў без выратавальнай камізэлькі і доўга пратрымацца ў ледзяной вадзе не змог. Вядуцца пошукі цела.

**Яна СВЕТАВА**

**НАРОДЖАНЫЯ 10 сакавіка**

**Гэта глыбока эмацыянальныя асобы, іх лёгка параніць, яны балюча рэагуюць на адмоўнае рашэнне. Жадаючы абараніць сябе, сыходзяць у асабісты, недасягальны эмацыянальны свет. Клапатлівыя і разумныя, ставяць павагу да асобы вышэй за ўсё. Іх шлях да поспеху даволі лёгкі, але некаторыя здольныя ахвяраваць кар'ерай дзеля асабістага жыцця. Умеюць дзейнічаць у патрэбны момант, знаходзяцца ў выйгрышы, але ім неабходна памятаць, што шчасце не можа быць вечным. Яны любяць бавіць час у цёплай абстаноўцы з блізкімі сябрамі і шчаслівыя, калі з'яўляюцца душой кампаніі.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.35 | 19.06 | 11.31 |
| Віцебск | — 7.25 | 18.54 | 11.29 |
| Магілёў | — 7.25 | 18.56 | 11.31 |
| Гомель | — 7.21 | 18.53 | 11.32 |
| Гродна | — 7.50 | 19.21 | 11.31 |
| Брэст | — 7.49 | 19.23 | 11.34 |

**Месяц**

***Першая квадра 8 сакавіка.***
***Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ганны, Івана, Пятра, Севасцьяна, Сяргея.*
***К.*** *Бенядзікта, Канстанціна.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Чым больш спіш — тым больш спаць хочацца. Чым даўжэй ясі — тым часцей апетыт прыходзіць. І толькі з працай неяк усё не так.

**Існуюць дзве прычыны, з-за якіх можа тармазіць камп'ютар:**
**1. Вірус.**
**2. Антывірус.**

Заклік па тэхніцы бяспекі.

«Паважаныя жанчыны, калі вы на працу прыйдзеце ў залішне свабодным адзенні — сцеражыцеся адкрытых частак механізмаў, якія працуюць. Калі адзенне занадта прыстае да фігуры — сцеражыцеся механікаў!»




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 1114.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 сакавіка 2014 года.